ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—60 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца у гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СУБОТА, 22 сакавіка 1930 г.
№ 67 (3575)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

УВАГА ЭКСПАРТУ

Нам у гэтым годзе прыходзіцца выконваць экспартны плян у надзвычай складаных абставінах, створаных з аднаго боку хваляй крызісаў на замежных рынках і з другога боку—вострай антысавецкай кампаніяй, захапіўшай у сваё рэчышча і барацьбу з нашым экспартам. Да таго-ж, становішча нашага ўнутранога рынку ў гэтым годзе патрабуе скарачэньня экспазту па радзе тавараў спажывецкага характару, што ў сваю чаргу ставіць задачу фарсаваньня экспарту па іншых артыкулах. І адсюль, зразумела, тая максымальная ўвага, тая напружанасьць усіх сіл, якія патрабуюцца ад усіх нашых загатоўцаў і гандлюючых арганізацый і ўсяе нашае грамадзкасьці ў справе найлепшага выкананьня экспартнага пляну гэтага году.

Між тым, ход выкананьня экспартнага пляну ў БССР мы ня можам пакуль лічыць здавальняючым. За пяць месяцаў гэтага году наш экспартны плян выкананы толькі на 26 проц.—гэта ніжэй тэмпу выкананьня пляну па Ўсім Саюзе (29 проц.). Праўда, тут прыходзіцца ўлічыць тую акалічнасьць, што для раду асноўных экспартных артыкулаў сэзон яшчэ не наступіў—напрыклад, лес мы будзем вывозіць за мяжу пераважна ў трэцім і чацьвертым квартале. Але тым больш мы павінны падрыхтавацца да напружанай экспартнай работы ў другім паўгодзьдзі, якое пачнна поўнасьцю пакрыць недавыкананьне ў першым паўгодзьдзі.

Ня гледзячы на нясприяючыя ўмовы надвор'я, вываз экспартных матар'ялаў у нас ідзе больш-менш нармальна. І тут наўрад ці чакаюць нас няпрыемнасьці. Але затрыманьне адбываецца з адгрузкай лесаматар'ялаў за мяжу. Гэта затрыманьне часткова здараецца з прычыны марудной работы заграничных прыёмшчыкаў і часткова з прычыны несваячасовай падачы пляцформаў.

Другі асноўны артыкул нашага экспарту—гэта шчаціна. Тут мы да гэтага часу мелі такое становішча, што нашы шчацінныя фабрыкі ня былі нагружаны і ня выконвалі экспартнага пляну з прычыны незабясьпечанасьці сырцом, як беларускім, так і прывозным. Але ў апошнім часе наступіла значнае паляпшэньне з паступленьнем сырцу і шчацінныя фабрыкі з лютага пачалі набліжацца да выкананьня пляну. Наша задача зараз заключаецца ў тым, каб шчацінныя фабрыкі фарсавалі сваю работу і, не адкладаючы на апошні квартал, перапрацавалі-б паступаючы сырэц э тым, каб папоўніць прарывы першых двух кварталаў. Таксама, як са шчацінай, нам трэба кінуць усе сілы на хутчэйшую адсартоўку і адгрузку ільна-валакна.

Ёсьць у нас адна галіна—утыльсырэц і другарадныя прадметы экспарту—якая мае вельмі шырокія пэрспэктывы і можа служыць вялікім падтрыманьнем для нашага экспарту. Трэба сказаць, што параўнальна з мінулымі гадамі мы тут маем значны зрух—напэўна, мы да пачатку мая зьбярэм такую колькасьць утыльсырцу, якую мы сабралі за ўвесь мінулы год. Ня гледзячы на тое, што з мая пачынаецца самы гарачы сэзон па зборы ўтыльсырцу. Але ўсё-ж можна сказаць, што мы толькі пачынаем па-сапраўднаму гэту работу, і наўрыд магчымасьці далёка яшчэ ня вычарпаны. На гэты важнейшы вучастак экспартнай работы трэба як у горадзе, так і на вёсцы мабілізаваць увагу партыйцаў, камсамольцаў і ўсяе савецкае грамадзкасьці. У тэй вялікай колькасьці адкідаў, якія раскіданы па гарадох і вёсках і пакуль нескарыстаных, крыюцца вялікія сумы так патрэбнай нам валюты. Міма гэтага факту мы ня можам і не павінны прайсьці. У Беларусі ў хуткім часе будзе абвешчаны трохмесячнік па зборы ўтыльсырцу і абавязак усякага партыйца і камсамольца, як і ўсякага актывістага—грамадзкага працаўніка — зрабіць усё, каб гэты трохмесячнік прайшоў з максымальнай актыўнасьцю.

Прыходзіцца яшчэ сказаць аб якасьці нашых экспартных тавараў, якая ва многім зьвязана з якасьцю нашай экспартнай работы наогул. Для таго, каб дабіцца больш высокіх і больш рэнтабэльных цэн, нам трэба даваць высокаякасны тавар.

А што датычыць якаснага ўзроўню нашай экспартнай работы, дык тут прыходзіцца сказаць, што нашы загатоўцы і экспарцёры яшчэ не ўсьвядомілі ўсёй важнасьці і адказнасьці экспартнай работы. На мясцох, а часамі і ў цэнтры, яшчэ працуюць пад халадком, з пераборамі, і ўвесь час прыходзіцца напамінаць, націскаць, варушыць—гэта зусім ненармальна. Скрусындыкат (беларуская кантора), маючы ў сябе на складзе партыю конскага вопасу, ніяк ня можа дагавацца з Белдзяржгандлем аб цане—і тавар застаецца ляжаць неэкспартаваным. Або другі прыклад. Белкаапсаюз, невядома па якіх прычынах і матывах, затрымлівае ў сябе на складах значную партыю рызьзя і не перадае яго Белдзяржгандлю для пераапрацоўкі і экспарту. Гэтыя агідныя, гэтыя дробязныя спрэчкі паміж савецкімі ўстановамі трэба спыніць раз на заўсёды—яны зусім нецярпімы ў нашых умовах.

Побач з пяцігодкай і прамфінплянам мы павінны мабілізаваць усе сілы рабочае клясы вакол пытаньняў выкананьня экспартнага пляну. Гэтага патрабуе увесь ход нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Не дапушчаць скрыўленьняў

(Да месячніка ашчаднасьці)

У працэсе правядзеньня агітацыі за «месячнік ашчаднасьці» на мясцох дапускаецца рад адступленьняў ад асноўных прынцыпаў ашчаднае справы.

Гэтыя парушэньні выяўляюцца ў тым, што часта па агульных сходах рабочых і служачых прымаюцца рэзалюцыі і пастановы аб **абавязковым** хаваньні вызначанай часткі зарплаты ў ашчадных касах з умовай **незыдтаканьня гэтых грошай;** прымаюцца таксама пастановы аб штомесячных адлічэньнях у ашчадкасы з зарплаты на працягу раду год падрад, да капца пяцігодкі і г. д.

Такім чынам, у мэтах прыцягненьня ўкладчыкаў у ашчадкасы ўводзяцца элемэнты **грамадзкага ўзьдзейнічаньня** і парушаецца прынцып **поўнай добраахвотнасьці.**

Трэба ўнесьці яснасьць у гэта пытаньне. Уклады ў ашчадкасы прадстаўляюць сабою **часова вольныя сродкі працоўных,** г. зн. сродкі бягучага асабістага бюджэту кожнага. Таму характэрнай асаблівасьцю ўкладаў у ашчадных касах зьяўляецца тое, што **распараджэньне ўкладам не абмежавана і ня можа быць абкежавана ні часам захоўваньня іх у ашчадкасе, ні чым-небудзь іншым.** Укладчыку ашчаднае касы даецца поўнае права і магчымасьць карыстацца сваім укладам на сваім жаданьні, **атрымоўваць яго з ашчадкасы ў любы час,** калі ў яго зьяўляецца патрэба ў гэтым... У тым і заключаецца розьніца паміж **дзяржпазыкамі і ашчаднымі касамі,** што пры дапамозе пазык дзяржава мабілізуе на сацыялістычнае будаўніцтва зьберажэньні працоўных у якасьці **доўгатэрміновага** крэдыту, а ашчадныя касы служаць для таго, каб захоўваць у іх **часова-вольныя сродкі** працоўных. **Ашчадкаса—кашэль працоўных.**

Асноўны прынцып прыцягненьня укладаў у ашчадныя касы — гэта прынцып добраахвотнасьці. У адносінах да ашчадных кас ня можа і не павінна мець месца ні ў якой ступені **прымусовасьць нават і ў форме грамадзкага узьдзейнічаньня.** З гэтага пункту погляду ня вытрыманы ўсялякія рэзалюцыі аб абавязковым захоўваньні сродкаў у ашчадкасе.

Поравень з бястэрміновымі укладамі ашчадныя касы прымаюць і так званыя мэтавыя **тэрміновыя ўклады** на тэрмін ад 3 месяцаў да 1 году. Сутнасьць гэтых укладаў заключаецца ў тым, што яны даюць магчымасьць працоўным рабіць з драбніц накапленыя на якіясьці мэты, як: на набыцьцё патрэбных рэчаў, на водпуск, экскурсію і г. д. Адзэй з формаў папулярызацыі такіх мэтавых накапленьняў зьяўляецца мэтад **заключэньня індывідуальных дагавароў працоўных з ашчадкасаю.** Але і мэтавыя накапленьні і заключэньне такіх індывідуальных дагавароў павінна праводзіцца на пачатках **поўнай добраахвотнасьці** кожнага працоўнага. Трэба падкрэсьліць, што і дагавор не абмяжоўвае права ўкладчыка карыстацца сваім укладам па сваім жаданьні; сутнасьць індывідуальнага дагавору ў тым, што ён палягчае працоўнаму, у парадку ўзятага на сябе дагавору, **маральнага абавязацельства,** зрабіць мэтавыя накапленьні, але ў той-жа час падпісаньне дагавору не накладае на падпісаўшага яго ніякіх іншых абавязацельстваў у адносінах парадку карыстаньня сваім укладам. Паводле **дагавору, кожны ўкладчык мае права атрымліваць свой уклад з ашчадкасы ў любы момант і да сканчэньня тэрміну яго.**

Рад скрыўленьняў і парушэньняў палітыкі ўнутранога дзяржкрэдыту паогул адзначаецца ў апошні час і ў адносінах пазык, што вызначаецца, напрыклад, ва ўстанаўленьні з боку камісій садзейнасьці **кантролю над выйгрышамі па пазыках** і г. д. Такія перагібы толькі шкодны для справы; яны граюць толькі на руку клясаваму ворагу, які вядзе шырокую агітацыю супроць дзяржкрэдыту.

Л.

У бліжэйшыя-ж дні стварыць кармавыя фонды ў калгасах

Без мабілізацыі кармоў немагчыма калектыўнае ворыва

Ударыць па кулаку, які, ухапіўшыся за недахопы ў кармавой справе, імкнецца даць нам бой на гэтым адсталым вучастку працы

Злачынная бясьпечнасьць

У Рагачоўска-Жлобінскім агракамбінаце не хапае кармоў

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

У калгасах Рагачоўска - Жлобінскага агракамбінату вельмі мала клапаціліся аб стварэньні кармавых фондаў. У абагуленыя хлявы, праўда, была сабрана пэўная колькасьць сена, але па радзе калгасаў яно вылавалася зусім безгаспадарча. Аб цьвёрдых нормах дачы кармоў ня прыходзіцца і гаварыць. Адзначаны выпадкі, калі замест саломы на подсьціл ішло сена.

Па некаторых калгасах Гарадзецкага куста былі і такія выпадкі, калі каровы стаялі на калені ў сене і тапталі яго.

Кармоў не хапае. Ёсьць асобныя калгасы, дзе няма нават запасу кармоў на адзін дзень.

Біваны ў гэтым куставым аб'яднаньні, якія, добра ведаючы становішча на мясцох, ніякіх мер да стварэньня патрэбных абагуленых кармоў ня прымалі. Гарадзецкі куст, напрыклад, абмежаваўся пасылкаю паперкі агракамбінату з патрабаваньнем... даставіць яму кармы.

Трэба прыняць рашучыя і тэрміновыя меры, каб мабілізаваць тыя запасы кармоў, якія ёсьць яшчэ на мясцох і стварыць кармавыя фонды для забесьпячэньня патрэб калгасаў у часе галавых работ. Трэба таксама ўстанавіць строгі кантроль над выдаткаваньнем кармоў у абагуленых хлявох.

А. М.

Спробныя выезды ў поле

Праўленьне Белкалгасцэнтру прызнала патрэбным, каб у кожным калгасе да пачатку палавых работ правесьці спробныя выезды ў поле брыгад калгасьнікаў. Спробныя выезды брыгад у поле павінны адбывацца пасьля складаньня рабочай праграмы і размеркаваньня рабочай і цягавай сілы, прычым гэтыя выезды трэба зрабіць за некаторы час да пачатку палавых работ (ворыва, вываз-ка ўгнаеньня, баранаваньне, пасеў).

Перад спробным выездам у поле трэба на вытворчых нарадах палавых брыгад падрабязна абгаворваць пляны будучых работ брыгады, высьветліць заданьні і абавязкі кожнага працаўніка брыгады і яго месца ў агульнай рабоце. У часе спробнага выезду брыгадзіры павінны ўважліва сачыць за працэсамі работы і вывучаць усе недахопы і памылкі.

Пасьля спробных выездаў брыгадзіры разам з кіраўніком палаводзтва павінны будуць падагуліць вынікі выездаў і падрыхтаванасьць кожнай брыгады для работы, а таксама падрыхтаванасьць цягавай сілы, вупражы і машын пры шырокім абмеркаваньні гэтых вынікаў на вытворчых нарадах калгасаў.

У гэтых спробных выездах у поле, якія вяўляюцца першым экзамэнам на падрыхтоўцы да сяўбы, павінны прыняць актыўны ўдзел аграномы і работнікі брыгады, якія працуюць на вёсцы.

„Слабая адгрузка добрускае крэйды

Мазырскі акрэз выказаўся за зьмяншэньне завозу вапны.

У свой час было дана заданьне развезьці гужавым шляхам крэйдавых адкідаў з Добрушу 1.500—2.000 тон бліжэйшым саўгасам і калгасам і адправіць па чыгунцы з 1-III па 15-IV для Мазыршчыны і Гомельшчыны 585 вагонаў—каля 9.400-10.500 тон.

Выкананьне гэтых заданьняў ідзе надзвычайна кепска. Гомельскі акрпаляводсаюз усё яшчэ ня здолеў арганізаваць гэтую справу як належыць. З 1-III павінна было кожны дзень грузіцца па 13 вагонаў—фактычна-ж да 10-III грузілася толькі па 8 вагонаў крэйдавых адкідаў.

Мазырскаму акрэзу было запрапанавана тэрмінова даць разнарадку на 6.000 тон добрускае крэйды. Дае-ж ён толькі на 960 тон. Нам акр. акрэз т. **Сямітка** зацьвярджае пастанову нарады пры акрэзе аб зьмяншэньні... завозу вапны.

Гомельскі акрэз таксама не зрабіў усяго патрэбнага, каб фарсаваць адгрузку. У Гомелі б'юць трывогу, што няма вагонаў пад пагрузку, пішуць аб гэтым НКЗ. На справе-ж аказваецца, што на Добрускай фабрыцы выгрузка ўвесь час перавышае нагрузку і вагоны ёсьць.

ВЕРАСЕК.

Загатоўка насеньня пасеўных траў пад пагрозаю зрыву

Праўленьне Белкаапсаюзу канстатавала, што пералому ў загатоўцы насеньня траў не паступіла. Разьвёрстка ня выканана.

Некаторыя каапэрацыйныя акруговыя арганізацыі злачынна нядбайна адносіліся да работы па загатоўцы патрэбнае колькасьці насеньня пасеўных траў.

Праўленьне Белкаапсаюзу вынесла суровую вымову з папярэджаньнем Бабруйскаму, Мазырскаму і Полацкаму алда. БКС за невыкананьне пляну і няпрыняцьце мер да ўзмацненьня работы па загатоўках пасеўнага матар'ялу.

БАЯВЫ АДКАЗ

на выступленьне чорнага вараньня

Працоўныя СССР ў саюзе з сусьветным пралетарыятам жалезнай рукой спыняць усякую спробу інтэрвэнцыі

Цясьней вакол партыі Леніна

Адказ працоўных БССР

СУСЬВЕТНАЙ БУРЖУАЗІІ НЯ УДАСЦА САРВАЦЬ БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ

З усіх месц Беларусі паступаюць у рэдакцыю рэзалюцыі пратэсту супроць той шалёнай антысавецкай кампаніі, якую падняла сусьветная буржуазія і яе верныя слугі—царкоўнікі ўсіх колераў.

— **Рабочыя гарбарні «Бальшавік** з абурэньнем адзначаюць, што агенты капіталістых—папы ўсіх масьцей, на чале з папай рымскім, пад выглядам абароны рэлігіі ў СССР, якая нібы прасьледуецца, разам з генэральнымі штабамі ўсіх капіталістычных армій рыхтуюць крыжовы паход супроць краю будуючагася сацыялізму.

У адказ на гэту агідную правакацыю сусьветнага імпэрыялізму рабочыя гарбарні «Бальшавік» абавязуюцца напружаць усе сілы да выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, да ўзмацненьня баяздольнасьці Чырвонай арміі.

— **Агульны сход рабочых і служачых транспартнага трэсту** выказвае абурэньне тым антысавецкім цкаваньнем, якое зараз вядзецца супроць СССР з тою мэтаю, каб выклікаць узброены напад на край дыктатуры пралетарыяту. У адказ на гэта **рабочыя і служачыя ўносяць 1 проц. месячнага заработку на ўзмацненьне Чырвонай арміі.**

— **Рабочыя фабрыкі «Рабочы»** заяўляюць, што ў выпадку ўмяшальнасьці імпэрыялістых у нашы ўнутраныя справы, мы дамо ім такі-ж адпор, як гэта было на Кітайскай чыгунцы.

Рабочыя абяцаюць узмацніць работу па выкананьні пяцігодкі ў чатыры гады.

— **Рабочыя заводу імя Домбаля** ў адказ на крыжовы паход, які рыхтуецца супроць СССР, абяцаюць яшчэ больш узьняць прадукцыйнасьць працы, поўнасьцю выканаць прамфінплян, 100-процантнае ўступленьне ў рады Асоавіяхіму для ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР.

— **Калектыў працаўнікоў Барысаўскага ЦРК** у адказ на выступленьне папы рымскага заяўляе, што на ўсялякія спробы контр-рэвалюцыянэраў усіх колераў дадуць рашучы і дружны адпор.

— **Рабочыя і служачыя заводу імя Камінтэрну** ў Нова-Барысаве ў сваёй рэзалюцыі заяўляюць:

— Мы нікому не дазволім перашкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, і, як раней, у адказ на напад кітайскіх бела-бандытаў, яшчэ цясьней згуртуем свае рады вакол кампартыі, будзем яшчэ больш узмацняць баяздольнасьць нашай Чырвонай арміі і ў патрэбны момант усе, як адзін, станем пад яе баявыя сьцягі.

У адказ на выступленьне папы Пія XI мы пастанаўляем: **адпрацаваць два дні на карысьць калектывізацыі, і паўторна патрабаваць ад Барысаўскага гарсавету зачыненьня малітвеных дамоў, аб чым раней** мы прасілі у сваіх падпісных лістох

Няхай жыве ленінская партыя!

— **Навуковыя працаўнікі г. Менску** ў адказ на правакацыю сусьветных імпэрыялістых даюць абяцаньне па 100 проц. падпісацца на пазыку «5-цігодка ў чатыры гады».

— **Калектыў супрацоўнікаў ЦВК БССР** у адказ на падрыхтоўку крыжовага паходу дранежнікі сусьветнага капіталу супроць СССР пастанаўляюць мабілізаваць усю ўвагу на палянпшэньне працы апарату шляхам яе рацыяналізацыі і ўзмацненьня працыцыпліны, каб дабіцца найбольшай эканоміі сродкаў для ўзмацненьня нашай абароназдольнасьці, узмацніць сваю ваенную падрыхтоўку, ажыцьцявіўшы лёзунг—ні аднаго супрацоўніка без вайсковых ведаў і па-за радамі Асоавіяхіму, узмацніць сувязь і дапамогу Чырвонай арміі, вернаму вартаўніку сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Атрыманы таксама рэзалюцыі пратэсту **ад асьветнікаў 23-ай, 14-й, ЦД школы, 19-й школы г. Менску.**

Усе, як адзін, станем на абарону СССР

МАСКВА. 19-га сакавіка на фабрыках і заводах Масквы адбыліся мітынгі пратэсту супроць крыжовага паходу на чале з папай рымскім працягвалася. Рабочымі ўхвалена шмат рэзалюцый з патрэбаваньнем арганізаваць магутную дэманстрацыю пратэсту супроць выпадаў чорнай рэакцыі і прадэманстраваць сваю гатоўнасьць цьвёрда стаяць на варце інтэрэсаў Савецкага Саюзу.

ЛЕНІНГРАД, 20. На «Красном Треугольнике» адбыліся мітынгі і сходы, прысьвечаныя панскаму выступленьню. Ва ўхваленых рэзалюцыях гаворыцца: «Антысавецкія набажэнствы ў Англіі і Польшчы рэзка праваліліся. Мы, рабочыя, «Красного Треугольника» заяўляем, што ўсякія спробы парушыць нашае мірнае будаўніцтва спаткаюць зьвіншальны пралетарскі адпор.

ГОЛАС НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ ЛЕНІНГРАДУ

На вытворчай канфэрэнцыі навуковаследчых інстытутаў рад буйных вучоных выступіў з гарачым пратэстам супроць «крыжовага паходу», які рыхтуецца заходня - эўрапэйскай буржуазіяй. З гарачай прамовай выступіў акадэмік Н. Я. Мар: «У цяперашнім антысавецкім цкаваньні асабліва абураючым зьяўляюцца не паводзіны папы, а маўчаньне заходня - эўрапэйскіх вучоных. Не знайшлося нават групы заходня-эўрапэйскіх вучоных, якія адкрыта заявілі-б, што яны абураны гэтай нячуванай агласьлю...»

Такія-ж мітынгі пратэсту супроць падрыхтоўкі крыжовага паходу на СССР адбыліся ва ўсіх буйных гарадох неабсяжнага Савецкага Саюзу. Усюды работы і працоўнае сялянства заяўляюць аб сваёй гатоўнасьці цьвёрда абараніць заваёвы Кастрычніка.

20.000 выйшлі на вуліцу для пратэсту

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Учора на ўсіх фабрыках і заводах Барысава адбыліся масавыя мітынгі пратэсту. Увечары адбылася вялікая дэманстрацыя працоўных гораду, у якой прымала ўдзел звыш 20.000 чал. З вялікім уздымам прайшоў мітынг, на якім прынята рэзалюцыя, якая патрабуе спыненьня антысавецкага цкаваньня; пралетары Барысава ў адказ на крыжовы паход абяцаюць зрабіць усё магчымае, каб выканаць з перавышэньнем прамфінплян.

ВЫКРЫТА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ НА УКРАІНЕ

На працягу раду год група контр-рэвалюцыянэраў вяла шкодніцкую работу ў Наркамземе і іншых установах УССР, усямерна ўзмацняючы пазыцыі кулацтва і імкнулася накіраваць с. г. Украіны па капіталістычным шляху

ХАРКАЎ, 19. На сходзе спэцыялістых і студэнтаў с. г. інстытуту наркамзем Украіны т. Дзямчанка зрабіў даклад аб выкрытай ДПУ контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай арганізацыі ў сельскай гаспадарцы Украіны. Захапіўшы камандныя пасты ў Наркамземе, Дзяржпляне, Укрсельбанку, с.-г. каапэрацыі, шкодніцкая арганізацыя сьвядома і сыстэматычна скажала асноўныя палітычныя дырэктывы кампартыі і савецкага ўраду, прабуючы накіраваць сельскую гаспадарку па капіталістычным шляху разьвіцьця. Шкодніцкая арганізацыя складалася з асоб у мінулым актыўных дзеячоў памешчыцкага земства, былых кадэтаў, манархістых і меншавікоў. Арганізацыя, ня спыняючыся перад падлогамі, скарыстоўвала для ўзмацненьня кулацкае гаспадаркі вялізныя дзяржаўныя рэсурсы, прызначаныя для беднаты. Злачынная палітыкай у галіне сартыроўкі насельня група прабавала прывесьці да падзеньня агульнай валавой прадукцыі збожжа.

Адзін з галоўных кіраўнікоў контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, былы актыўны дзеяч Харкаўскага памешчыцкага земства **аграном Рэзьнікаў,** які ўвайшоў у кампартыю па даручэньні групы для лепшага вядзеньня шкодніцкай работы, так выначае асноўныя мэты арганізацыі: «задачай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі было скарыстаць органы савецкай улады, у першую чаргу Наркамзем, для гаспадарчага ўзмацненьня кулака. Моцная фермэрская гаспадарка павінна была стварыць сваю палітычную партыю, значыць патрабаваць сабе месца ў палітычным кіраўніцтве краінай». У выніку шкодніцкай дзейнасьці хутары, атрубы разьвіваліся ня толькі ў тых раёнах, дзе яны было шырока распаўсюджаны пры Сталыпінчыне, але і ў новых раёнах. Група вяла сыстэматычную падрыўную работу супроць саўгасаў, калгасаў, усямерна перашкаджаючы іх разьвіцьцю: крэдытнай дапамогай кулацтву, палітыкай прэм'яваньня кулацтва, палітыкай згрупаваньня асноўных агранамічных мерапрыемстваў у кулацкіх гаспадарках узмацняла іх, прабуючы давесьці гэтым пераважнасьць капіталістычных форм перад сацыялістычнымі. Арганізацыі даваліся простыя дырэктывы, каб **ва што-б там ні стала задушыць сацыялістычныя расткі сельскае гаспадаркі.**

Арганізацыя захапіла ў свае рукі кіраўніцтва курсамі па нерападрыхтоўцы спэцыялістых сельскае гаспадаркі. Пры дапамозе сакратара курсаў **Даленка** вяла работу па падрыхтоўцы масавых шкодніцкіх кадраў.

Другая шкодніцкая група доўгі час «працавала» ў лясной гаспадарцы Украіны. Гэта група складалася з высокакваліфікаваных спэцыялістых, прафэсароў (большасьць былых чыноўнікаў лясного дэпартаманту) Гурскага, Калесьнікава, Шустава, Каваленка, Падалкі, Марчэнка. Яны скарысталі сваё становішча на адказных пасадах (Калесьнікаў намесьнік начальніка лясного кіраўніцтва, Марчэнка плянаваў лясную гаспадарку ў Дзяржпляне), каб усімі мерамі захаваць былыя памешчыцкія лясныя масывы, у прыватнасьці, пад сьцягам занаведнікаў.

Спадзяючыся на зварот памешчыкаў, шкодзікі даводзілі каштоўнейшы лес да такога стану, калі ён пачынаў гніць і заражаць суседнія лясы, тады яго заставалася толькі скарыстаць на дровы. Гэта контр-рэвалюцыйная арганізацыя, уходзячы карэньнямі ў асяродзішча рускіх памешчыкаў, кадэтаў і меншавікоў, была яскрава выяўленай вялікадзяржаўнай нацыянальнічай арганізацыяй, якая адцяньвала украінскую агранамію з кіраўнічых пастоў, і тым распальвала нацыянальную варожасьць. Гэта, аднак, ня перашкаджала ёй супрацоўнічаць з «СВУ», як арганізацыяй украінскага буржуазнага шавінізму і пятлюраўшчыны.

Украінская контр-рэвалюцыя перад пралетарскім судом

ДОПЫТ ПАДСУДНАГА ПАЎЛУШКАВА

ХАРКАЎ, 19. Суд перайшоў да допыту падсуднага **Паўлушкава.** Паўлушкаў—кіеўскі студэнт, **сын папа,** арганізатар і кіраўнік «Славой тэрарыстычнай арганізацыі »СУМ» (саюз украінскай моладзі), якая дзейнічала пад непасрэдным кіраўніцтвам Яфрэмава.

На запытаньне пракурора **т. Міхайліка** аб праграме «СУМ» Паўлушкаў адказвае, што «СУМ» арганізацыйна быў пабудаван таксама, як і «СВУ», паводле прынцыпу пяцёрак. На чале ўсіх пяцёрак знаходзілася цэнтральная пяцёрка, якой кіраваў Паўлушкаў. У выпадку неабходнасьці «СУМ» павінен быў выступіць, як асобная баявая адзінка.

ХАРКАЎ, 21. Канчаецца допыт абвінавачанага Паўлушкава. Допыт пераходзіць да пракурора **т. Ахматава.** Ён асьвятляе характар усіх гутарак, якія вялі кіраўнікі «СВУ» аб «напрамку» работы савецкіх дактароў.

На пытаньне пракурора, якое ўражаньне зрабіла на Яфрэмава сьмерць Леніна, Паўлушкаў зусім спакойна, як быццам ён гаворыць аб звычайнай рэчы, адказвае: «Я адчуваў, што ён прыняў гэтае паведамленьне, як можна прыняць паведамленьне аб сьмерці вялікага чалавека, аднак, у той-жа час ён сказаў, што вялікага палітычнага значэньня гэта сьмерць мець ня можа. Тут ім была выказана думка: **«Шкада, што калі ў свой час Каплан ня скончыў сваёй справы, дык ёй не дапамаглі закончыць дактары, якія лячылі Леніна».**

З далейшых адказаў на пытаньні Паўлушкаў прызнае, што для вызваленьня ад бальшавікоў лічылася магчымым **аб'яднаць рэшткі пятлюраўскай арміі з польскай, з расійскімі белагвардзейскімі і ўсякімі несавецкімі элемэнтамі, толькі-б скінуць савецкую ўладу.**

Пасьля допыту Паўлушкава грамадзкі абвінаваўца т. Любчанка агалашае вытрымку са справаздачы газэты «Сіла» аб харкаўскім працэсе. Гэта былі вясёлыя мінуты. Сьмяяліся залы, сьмяяліся бакі, ня мог стрымаць усьмешку і суд. Сьмяяліся і падсудныя, «Сіла» паведамляла, што Яфрэмаў быў зусім замучан допытам і ён пяць раз прасіў перапынку, але суд яму ў гэтым адмовіў. Не жадаючы расстацца з легендаю аб Яфрэмаве, як нацыянальным «праваадыру», «Сіла» надрукавала, што Яфрэмаў на судзе выклікнуў: «Няхай жыве незалежная Украіна» (пятлюраўскі лёзунг). На запытаньне Любчанкі, ці ёсьць у гэтым паведамленьні «Сілы» хаця частка праўды, Яфрэмаў адказаў, «што гэта хлусьня».

Суд пераходзіць да допыту падсуднага **Матушэўскага.**

Рабочыя дэманстрацыі па усей Польшчы

ПРАВАЛ ВЫСТУПЛЕНЬНЯ БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТЫХ

Беларускі нацыянал-фашызм — складаная частка фашысцкага лягеру. Падрыхтоўка крыжовага паходу супроць Савецкага Саюзу праходзіць пры іх непасрэдным і актыўным удзеле. У дзень антысавецкіх набажэнстваў 19-га сакавіка нацыянал-фашысцкі штаб Луцкевіча пастанавіў вывесьці свае «жывыя сілы!!.. на вуліцы. Група беларускіх фашысцкіх студэнтаў пры дапамозе віленскае паліцыі сабралася каля будынку Цэнтральнага Сакратарыяту Беларускага рабоча-сялянскага клюбу, сарвала і паламала [illegible] беларускага каапэрацыйнага банку.

Такім чынам [illegible] задуманая палітычная дэманстрацыя скончылася поўным правалам.

ВЯЛІЗАРНЫЯ РАБОЧЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ВАРШАВЕ

Як паведамляе віленскі друк, у Варшаве, у дзень 19-га сакавіка, у сувязі з антыбальшавіцкімі набажэнствамі, якія павінны былі адбыцца паводле загаду рымскага папы, уся паліцыя была мабілізавана для папярэджаньня магчымых выступленьняў рабочых.

Ня гледзячы на гэта, 19-га сакавіка адбыўся ў Варшаве цэлы рад вялізарных рабочых дэманстрацый у адказ на крыжовы паход супроць СССР.

Спробы паліцыі разагнаць дэманстрацыі не ўдаліся, бо рабочыя зьбіраліся ў іншых мясцох і дэманстрацыі працягваліся далей.

Вечарам шматлікая рабочая дэманстрацыя сабралася каля будынку беларгвардзейскай пагромнай газэты «За Свабоду» і наладзіла новую дэманстрацыю пратэсту супроць цкаваньня Савецкага Саюзу. Дэманстранты выбілі ў рэдакцыі ўсе рацыяналізацыі, а ўзброеныя атрады паліцыі прышлі на дапамогу і разагналі дэманстрацыю.

ГАЛАДОЎКА ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 21. У Самборы выбухнула галадоўка 30 палітзьняволеных, якія патрабуюць паляпшэньня стравы і захаваньня рэжыму, устаноўленага для палітзьняволеных.

ГОЛАС 40 ТЫСЯЧ

4 гадзіны дня...

Буднічныя і спакойныя вуліцы гораду раптам запоўніліся гукамі аркестраў, мерным крокам дзесяткаў тысяч людзей.

З усіх вуліц і завулкаў дзесяткі калён рабочых, работніц, студэнтаў накіраваліся на Пляц Волі, каб выказаць свой пратэст супроць крыжовага паходу на СССР, які абвешчаны фашыстымі, на чале з рымскім папай, супроць кампаніі лжы і хлусьні.

Сотнямі сьцягаў, плякатаў на ўсіх мовах стракаталі калёны дэманстрантаў.

— У адказ на крыжовы паход супроць СССР узьнімем працоўную дысцыпліну, павялічым вытворчыя праграмы, выканаем пяцігодку ў чатыры гады!

— У адказ на паход узмацнім абарону краіны!—крычаць лёзунгі на плякатах.

4 з палов. гадзіны прабіла на гарадзкім гадзіньніку. Ня менш 40.000 дэманстрантаў запоўнілі Пляц Волі.

— Буржуазія,—кажа т. **Славінскі,**—узьняла супроць нас паход у той момант, калі мы падагульваем вынікі сацыялістычнага будаўніцтва, калі партыя прыступіла да рашучай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, калі ў капіталістычных краінах узьнімаецца моцная рэвалюцыйная хваля.

Капіталістычны сьвет перажывае зараз востры гаспадарча-палітычны крызіс. 20 мільёнаў беспрацоўных, да 60 мільёнаў галадаючых палічваецца ў капіталістычных краінах. Дзесяткі тысяч беспрацоўных выходзяць у галодны паход, патрабуючы хлеба. На вуліцах замежных сталіць разыгрываюцца жорсткія клясавыя баі. Буржуазія імкнецца выдаць выступленьні беспрацоўных, выступленьні рэвалюцыйнага пралетарыяту за «наступленьне Масквы», імкнецца запэўніць працоўных, што тут «рука бальшавікоў». Яна абвяшчае паход супроць бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту. Крыжовы паход—гэта дымавая завеса над ваеннымі плянамі імпэрыялістых. Гэта прапаганда вайны.

— Папа рымскі,—заўляе стары мэталісты т. **Андрэеўскі,**—у 1914 годзе благаслаўляў вайну. Інакш быць ня можа. Бо ён зьяўляўся і зьяўляецца служкай буржуазіі, абаронцай інтарэсаў капіталістых. Папа ўзьнімае хлусьлівую паклёпніцкую кампанію аб тым, што ў нас нібы прасьледуюць рэлігію і зусім не заўважае, што польскі фашысцкі ўрад закрывае сотні праваслаўных цэркваў.

— Папа і капіталісты,—кажа тав. **Буткевіч,**—двудушна выступаюць у абарону культуры, цывілізацыі і навукі, якіч «прасьледуецца ў СССР». Хто ж ня Рым, не папы палілі на вогніш

Перад пачаткам палявых работ

Папяровыя патокі замест жывога кіраўніцтва

У падрыхтоўцы да сяўбы яшчэ няма патрэбнага зруху

Да сяўбы засталіся пічаныя дні. Трэба зараз-жа пераключыцца на сапраўды баявыя тэмпы працы

АПОШНЯЕ ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ

(На пасяджэньні калегіі РСІ)

Месяц таму назад калегія ЦКК-РСІ праверыла, як цэнтральныя ўстановы рыхтуюцца да сяўбы. Становішча тады было надта нездавальняючае. Амаль усім цэнтральным установам ЦКК-РСІ былі тады даны дырэктывы аб безадкладнай перабудове ўсёй іх работы і прыняцьцем яе ў адпаведнасьць з сучаснымі бальшавіцкімі тэмпамі.

29-га сакавіка РСІ зноў праверыла, як выкананы яе дырэктывы. На пасяджэньні калегіі РСІ прысутнічалі прадстаўнікі большасьці ўстаноў. Аказваецца за тэты месяц справа падрыхтоўкі да сяўбы мала пасунулася ўперад. Цэнтральныя ўстановы вельмі марудна паварочваюцца тварам да калгасу, да вёскі. Замест сапраўднай падрыхтоўкі і кіраўніцтва, мы наглядаем папяровую блытаніну, спрэчкі намік установамі, якія ніяк ня могуць знайсьці агульнай мовы. Калі ўлічыць, што да сяўбы ўжо засталося вельмі мала часу, дык такія адносіны да пасеўнай кампаніі літаральна злачынныя.

Наркамзем, які павінен быў быць баявым штабам пасеўнай кампаніі, усё яшчэ ня здолеў ахапіць належным кіраўніцтвам падрыхтоўку да сяўбы. У выніку Наркамзем не рэагуе своечасова на пасобныя прарывы на пасеўным фронце і ня ўжывае адпаведных мер для іх своечасовай ліквідацыі.

Зямляўпарадкаваньне калгасаў за апошнія тыдні выпала з-пад увагі Наркамзему, ня гледзячы на тое, што ў радзе акруг тэмп яго замарудзіўся. Асабліва адстаюць Гомельская і Бабруйская акругі. Але працаўнікі НКЗ толькі мітусяцца і бытуюцца і ніяк ня могуць высьветліць сапраўдныя прычыны замаруджаньня тэмпу зямляўпарадкаваньня —у выніку яны ня могуць даць адпаведных дырэктыў. Арганізацыя агракамбінатаў, абслугоўваньне індывідуальнага сэктару, разьмеркаваньне і перакідка пасеўных фондаў, угнаеньне — усё гэта таксама выпала з-пад кіраўніцтва НКЗ. Мабілізацыя с.-г. спэцыялістых праведзена невыстарчальна. Не даволі ўвагі зьвярнуў НКЗ і на месячнік жывёлагадоўлі і на справу сіласаваньня

Белкалгасцэнтр, як ён кіраваў падрыхтоўкай калгасаў да сяўбы. Вытворчыя пляны для калгасаў на 32 старонках з сотнямі граф, якія прадэманстраваў тав. Калінін, гаворяць аб добрай папяровай прадукцыі канцылярыі Белкалгасцэнтру. Аказваецца, гэтыя вытворчыя пляны ня былі разьлічаны на масавую калектывізацыю, а толькі для старых калгасаў, рассылалі-ж гэтыя пляны ўсім калгасам. Пасьля гэтага Белкалгасцэнтр «выправіў» сваю памылку і паслаў калгасам другі рабочы плян. Але зноў такі на 10-ці старонках з сотнямі граф. За тое вельмі мала было зроблена для сапраўднага замацаваньня калгасаў, арганізацыі працы ў іх, ачысткі насеньня і абагуленьня сродкаў вытворчасьці.

Чыстка калгасаў дагэтуль яшчэ ня скончана, таксама як і арганізацыя батрацка - бяднацкіх груп у калгасах.

Урадам былі даны дырэктывы **Белсельтрэсту** аб папярэдняй пасеўнае плошчы саўгасаў. Але выкананьне гэтых дырэктыў зараз знаходзіцца пад пагрозай. Белсельтрэст дагэтуль ня ведае дасканала, колькі яму патрэбна насеньня, дзе яго хапае і куды трэба яго перакінуць. На папярэдніх вестках не хапае насеньня агародных культур і дугавых траў. З 98 трактараў якія патрабуюць рамонту, ёсьць запасныя часткі толькі для 41. Рабочыя калектывы саўгасаў слаба мабілізаваны вакол пасеўнай кампаніі. У саўгасах фармальна налічваецца 1.500 ударнікаў, але работа вядзецца не паўдарнаму, падрыхтоўка да сяўбы ў саўгасах не праведзена на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва.

Як у нас праводзіцца **кантрактацыя.** Па афіцыяльных лічбах Наркамзему як быццам здавальняюча. Але ў сапраўднасьці ў радзе месц кантрактацыя ў калгасах праведзена чыста фармальна, бюракратычна. Агенты Наркамзему і с.-г. кааперацыі абмяжоўваліся толькі падпісаньнем дагавароў старшынямі калгасаў. Дагаворы гэтыя не абмяркоўваліся ні праўленьнямі калгасаў, ні актывам калгасьнікаў У выніку стваралася сумненьне, наколькі гэтыя дагаворы будуць выкананы. Што датычыць кантрактацыі засеваў індывідуальных гаспадарак, дык аб гэтым Наркамзем ня думаў.

Прыкладам бюракратычных адносін да пасеўнай кампаніі можа паслужыць і Белстрамтрэст. Яшчэ ўвосень яго прадстаўнік у Маскве ўзяў на сябе абавязацельства па выраб 8.000 тон фасфарытнай мукі. Калі там пачалі сумнявацца ў магчымасьці выкананьня гэтага дагавору, ён адказаў: «я ведаю, што раблю». На аснове гэтага для БССР быў зьменшан завоз угнаеньняў. Але дагэтуль Страмтрэст не паклапаціўся своечасова пусьціць фасфарытныя заводы. У Крычаве завод яшчэ і зараз ня пушчаны. На запытаньне, чаму ня пушчаны завод, дырэктар Белстрамтрэсту на можа даць ніякага адказу, ён прапануе РСІ выехаць на месца і там азнаёміцца з сапраўднай прычынай.

Горная група ВСНГБ ўжо на працягу амаль двух год ніяк не магла канчаткова вызначыць пункты для ўстаноўкі вапнавых млыноў. Вапнадрабілкі часта вандруюць з аднаго месца ў другое. У выніку зрываецца плян вапнаваньня.

Белдзяржвыдавецтвам выдана каля 800.000 экз. розных с.-г. літаратуры. Але на месцах, там, дзе яны надта патрэбны, гэтых кніжак няма. Яны загрузьлі ў акругах, раёнах і ў крамах кааперацыі. Нічога ня зроблена, каб прасунуць гэту літаратуру да спажыўца. Падводзячы вынікі праверкі і выступленьняў прадстаўнікоў устаноў, парком РСІ **т. Калінін** падкрэсьліў, што, ня гледзячы на папярэджаньні з боку РСІ, цэнтральныя ўстановы ўсё яшчэ вельмі павольна рыхтуюцца да сяўбы. Спасьлаюцца па аб'ектыўныя лічбы ўмоны, імкнуцца ўзяць на сябе адказнасьць і пераладжыць яе на іншага Праз некалькі тыдняў, кажа ў заключэньне тав. Калінін, мы зноў праверым, як цэнтральныя ўстановы выконаюць дырэктывы партыі і ўраду. Мы будзем бязьлітасна біць на тых, хто ня будзе выпраўляць свае памылкі. Мы не дапусьцім, каб з-за непаваротлівасьці пашых цэнтральных устаноў была сарвана падрыхтоўка да сяўбы.

Я. П—кі.

СЫГНАЛЫ З КАРМАВОГА ФРОНТУ

Апошнія дні прынесьлі нам вельмі трывожныя весткі: у радзе раёнаў БССР пачынае ўжо адчувацца востры недахоп кармоў. Прычым няма кармоў у тых калгасах, якія поўнасьцю ці часткова ўжо абагулілі рабочую жывёлу

Аспоўнаю прычынай таго награжаючага становішча, якое зараз стварылася ў азначаных калгасах, зьяўляецца тое, што **стварэньне кармавых фондаў у іх рабілася зусім бесплянава, непрганізавана, бяз уліку сапраўдных патрэб.** Рабілася прыкладна так. Ад усіх калгасьнікаў браліся так званыя «кармавыя аванты», пасьля чаго лічылі кармавую праблему вырашанай. Многія-ж калгасьнікі аддаўшы частку сваіх кармоў у абагулены хлеў, пачалі другую частку кармоў, якая ў іх засталася, разбазарваць на бліжэйшых рынках. Аб тым, як скарыстоўвалі некаторыя калгасы, па віне кіраўніцтва кустоў. сабраныя імі «кармавыя аванты», яскрава сьведчыць карэспандэнцыя з Рагачоўска-Жлобінскага агракамбінату, якая сёньня друкуецца ў нас. Абагуленыя кармы выдаткоўваліся тут проста злачынна. Цьвёрдых норм дачы сена каровам і коням ня было. На падсьцілку сена скарыстоўвалася замест саломы. У некаторых калгасах гэтага агракамбінату кармы валяліся пад нагамі жывёлы, якая таптала і рабіла з іх гной.

Наколькі несьвядома падышлі да пытаньня забесьпячэньня кармамі абагуленай жывёлы ў некаторых мясцох, сьведчыць такі факт. У адным з калгасаў Сьмілавіцкага раёну, у якім была абагулена ўся рабочая жывёла, ніякіх абагуленых кармавых фондаў не стварылі, а кожны калгасьнік штодзенна прыносіў у абагулены хлеў сваю порцыю сена ці саломы. Так калгасьнікі насілі гэтае сена, пакуль не заявілі, што больш у іх кармоў няма. Зусім зразумела, што такі спосаб складаньня кармавых фондаў нічога станоўчага даць ня мог. Не гаворачы ўжо аб тым, што ніхто ня цікавіўся, колькі фактычна кожны калгасьнік прыносіў кармоў і колькі ён павінен быў даць штодзенна частка калгасьнікаў карыстаючыся нядбайнымі адносінамі кіраўнікоў да кармавое праблемы, свае кармы прадавала на рынках.

Зараз адчуваецца ўжо некаторы зрух у справе стварэньня кармавых фондаў у радзе раёнаў. Але і тут не абыходзіцца бяз шкодных перагібаў. Тыя самыя працаўнікі, якія раней зусім не зважачалі ніякай увагі вырашэньню кармавое праблемы, цяпер рашылі кармавыя фонды стварыць у парадку дэкрэтаваньня **Робяцца спробы ажыцьцёвіць гэту важнейшую справу не шляхам растлумачэньня усёй важнасьці стварэньня кармавых фондаў, не шляхам непасрэднага ўдзелу ў гэтай справе саміх калгасных мас і асабліва батрацка-бяднацкіх груп, а пры дапамозе адміністрацыйных націскаў і загадаў.** З Мазырчыны паведамляюць, што ў радзе месц, каб стварыць кармавы фонд, загадалі калгасьнікам здаць усю колькасьць кармоў, якая ў іх ёсьць. Зусім ня была ўлічана неабходнасьць пакінуць калгасьніку частку кармоў для пракармленьня дробнае жывёлы і аднае каровы, якія застаюцца ў яго індывідуальным карыстаньні.

Пытаньне стварэньня абагуленых кармавых фондаў у калгасах, гэта пытаньне на сёньешні дзень глыбока палітычнае. Трэба мець на ўвазе, што, не стварыўшы кармавых фондаў, мы ня здолеем прыступіць і з посьпехам скончыць калектыўнае правядзеньне палявых работ. Без кармавых фондаў немагчыма абагуленьне рабочае жывёлы, немагчыма калектыўнае ворыва.

Кулак вельмі добра зразумеў значэньне стварэньня кармавых фондаў у калгасах. Вось чаму мы і наглядаем яго ўзмоцненую дзейнасьць, якая накіравана супроць гэтага мерапрыемства. Кулак агітуе за разбазарваньне кармоў калгасьнікамі, ён шкодзіць нам у абагуленых хлявох. Між тым, мясцовыя работнікі ў радзе месц зусім не зважаюць належнай увагі барацьбе з кулацкай агітацыяй за разбазарваньне кармоў, за шкодніцтва ў абагуленым хляве. У радзе месц вакол гэтага пытаньня зусім не завострана ўвага батрацка-бяднацкіх груп і калгасных мас наогул.

У сьвятле гэтых фактаў шырокая растлумачальная работа за стварэньне абагуленых кармавых фондаў у калгасах, за рацыянальнае выдаткоўваньне кармоў і правільны нагляд за абагуленай жывёлай набывае асабліва значэньне.

Кармавыя фонды павінны быць створаны ва ўсіх калгасах у самыя бліжэйшыя дні. Гэта першачарговая задача, ад пасьпяховага ажыцьцяўленьня якой залежыць лосьпех сёлетняй бальшавіцкай сяўбы — аб гэтым павінны памятаць мясцовыя партыйныя, савецкія і земельныя арганізацыі.

Стварэньнем кармавых фондаў ня вычэрпваецца кармавая праблема. У кожным калгасе павінна быць забясьпечана сяўба кармавых траў, кораньплодаў і г д. Пашырэньне плошчы пад кармы ў БССР, сельская гаспадарка якой мае жывёлагадоўчы ўхіл, набывае асабліва значэньне. Нам трэба так разгарнуць насенаводзтва траў і кораньплодаў, каб у бліжэйшыя некалькі год мы ня толькі маглі-б забясьпечыць нашы ўласныя патрэбы, але нават вывозіць гэта насеньне заграніцу. У БССР для выкананьня гэтае задачы ёсьць усе магчымасьці.

Я. П—кі.

Партыйнае будаўніцтва

НА ДВА ФРАНТЫ

Рашучая барацьба супроць галоўнай небясьпекі—правага ўхілу і „левых" загібаў, якія льлюць ваду на млын клясавага ворага

Важнейшая задача партарганізацый—дакладна вывучыць, прапрацаваць і праводзіць у жыцьцё апошнюю пастанову ЦК УсеКП(б) і палажэньні артыкулу тав. Сталіна

Манэўр правых апартуністых

ПРАВЫЯ СПРАВЫ ПАД ПРЫКРЫЦЬЦЕМ «ЛЕВЫХ» ФРАЗ

Нядаўна адбыўся раённы сход **Крычаўскай** партарганізацыі па пытаньнях калгаснага будаўніцтва. Сход даў рад цікавых матар'ялаў аб стане калектывізацыі ў Крычаўскім раёне.

Выявілася, што ў практыцы калгаснага будаўніцтва ў раёне дапушчаны буйныя скажэньні дырэктыў партыі. У раёне адсутнічала пастаянная работа сярод беднаты і батрацтва, што пельга інакш ацаніць, як правай практыкай.

Ва многіх сельсаветах гора-калектывізатары ігнаравалі батрацка-бяднацкія масы і праводзілі калектывізацыю шляхам пагроз і запалохваньняў. Падрыхтоўчыя работы па арганізацыі калгасаў сельсаветы амаль не правялі. Замест упартай і настаяннай работы па ўцягненьні аспоўных мас сяляцтва ў калгасы і замацаваньні дасягнутых посьпехаў, мясцовыя работнікі правялі ў раёне «двухтыдніёвік калектывізацыі». Сельсаветы ўсю сваю работу па калгасным будаўніцтве праводзілі пад лёзунгам: «хто хутчэй».

Гэта стаўка на «суцэльную калектывізацыю за пару тыдняў», натыкала на, стварыла глебу для грубых скрыўленьняў і перагібаў.

Трэба адзначыць, што арганізацыя не прыступіла да вывучэньня і практычнага выкананьня задач, паказаных у артыкуле тав. **Сталіна «Головокружение от успехов».** Арганізацыя не скарыстала артыкулу т. Сталіна для таго, каб на аснове артыкулу, хутка, па-бальшавіцку выправіць дапушчаныя памылкі.

Партыйныя ячэйкі не правялі работы па папулярызацыі і растлумачэньні сялянскім масам артыкулу тав. Сталіна і новага статуту с.-г. арцелі. Такая бязьдзейнасьць арганізацыі была толькі на руку кулаку, які разгарнуў актыўную падрыўную работу і шалёную антыкалгасную прапаганду.

Частка членаў арганізацыі глыбока памылкова і няправільна зразумела артыкул тав. Сталіна. Ня варта казаць, што ў гэту частку ўвайшлі тыя камуністыя, якія, адчуваючы «головокружение» ад посьпехаў, дапусьцілі найбольш грубыя перагібы і скрыўленьні партыйнае лініі ў калгасным будаўніцтве.

Сход выявіў, што гэтыя партыйцы —гора-калектывізатары—пад прыкрыцьцём «левых» фраз, па сутнасьці праводзяць лінію правага апартунізму па практыцы. Гэта стала яшчэ больш відавочным, калі гора-калектывізатары адкрыта выступілі на райпартсходзе супроць артыкулу тав. Сталіна з шчырай абаронай сваіх памылак.

Цэлы рад таварышоў, у прыватнасьці т. т. **Качкоў, Лаўрэнаў, Вертліб, Філіпенка,** выступілі з цьвёрдай думкай аб тым, што «артыкул т. Сталіна трэба было разасьлаць у сакрэтным парадку». Гэтыя таварышы дагаварыліся, парэшце, да заяў аб тым, што «партыя ў пытаньнях калектывізацыі пайшла на адступленьне», што «селянін добраахвотна бяз націску ня пойдзе ў калгас» і г. д.

Зусім ясны сэнс гэтага манэўру. Таварышы, не жадаючы прызнаць сваіх памылак, імкнуцца апраўдаць іх «левымі» фразамі, прыкрываючы апошнімі сваю праваапартуністычную сутнасьць. Ня дзіва таму, што тав. Качкоў, парэшце, адкрыта заявіў:

— «Бухарын меў рацыю, калі гаварыў, што ня трэба сьпяшацца з калектывізацыяй».

Манэўр правых апартуністых быў рашуча выкрыты. Раённы сход партарганізацыі даў ім рэзкі і аднадушны адпор.

На гэтым прыкладзе добра відаць, што «левыя» перагібы вельмі часта зьяўляюцца лёгічным вынікам праваапартуністычных настрояў і правай практыкі. Нас ня здзіўляе таксама тая хуткая перамена поглядаў, з якою тав. Качкоў перайшоў ад балбатні аб «адступленьні партыі ў пытаньнях калектывізацыі» да шчырай абароны поглядаў правай апазыцыі. Такое двурушніцтва ўласьціва апартуністым правага і «левага» толку.

Крычаўскай партарганізацыі з гэтым фактаў патрэбна зрабіць адпаведныя вывады. **Рашуча выкрываючы «левых» фраззраў, арганізацыя павінна па-бальшавіцку разгарнуць бязьлітасную барацьбу з галоўнай небясьпекай—правым апартунізмам у тэорыі і на практыцы.**

Брыгадзір «Зьвязды» В-ў.

Аб аднэй „гутарцы" па тэлефону

18-га сакавіка ў **«Зьвязьдзе»** быў зьмешчаны артыкул **«На руку клясаваму ворагу».** У артыкуле паведамлялася аб грубых скажэньнях партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве, дапушчаных у **Самахвалавіцкім** раёне **(Меншчына).** У прыватнасьці, артыкул рэзка ставіў пытаньне аб раённым партакіраўніцтве, якое дапусьціла рад буйных праваапартуністычных памылак і не змагалася з «левымі» перагібамі. Пагоня за колькасьцю калгасаў без замацаваньня арганізаваных калектываў і без усялякай папярэдняй работы з батрацка-бяднацкімі масамі прывала да развалу калгаснага будаўніцтва ў раёне.

Як-жа кіраўнікі Самахвалавіцкай партарганізацыі прызнаюць свае памылкі і ўжываюць захады да выпраўленьня дапушчаных прарываў? Аб гэтым, да вядомай ступені сьведчыць наступны факт. Учора сакратар Самахвалавіцкага РК **т. Астроўскі,** пазваніўшы па тэлефону ў рэдакцыю, заявіў, што ўвесь артыкул зьяўляецца няправільным і «спрыяе зрыву калектывізацыі» (!)

Нічога не сказаўшы па сутнасьці артыкулу, не абвяргнуўшы на падставе канкрэтных фактаў яго зьместу, сакратар РК пагаварыў шмат паражаючых слоў аб тым, што «зьмяшчэньне артыкулу зьяўляецца галавацяпствам», што «Зьвязда» зрывае калектывізацыю»(!) і г. д., і г. д.

Нам добра вядомы і знаёмы такі мэтад «абвяргжэньня», да якога зьвяртаюцца ў цяжкую хвіліну апартуністыя правага і «левага» толку.

Апартуністыя, асабліва з ліку тых, якія адчуваюць «головокружение» ад посьпехаў, дапусьцішы рад грубых памылак, сказішы партыйную лінію ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва, парушышы дырэктывы партыі ў адносінах да серадняка, пасьля выкрыцьця іх непартыйнай лініі, упарта, рознымі мэтадамі, імкнуцца змазаць свае памылкі і апраўдаць іх. Да такога мэтаду, пасутнасьці, зьвярнуўся і т. Астроўскі.

Сон на пасту

Бялынкавіцкая парт'ячэйка **(Касьцюковіцкі** раён, **Магілеўшчына)** не перабудавала сваёй работы. Гэтым тлумачыцца тое, што ячэйка ня выканала асноўных партыйных дырэктыў на рабоце па вёсцы.

Ячэйка не разгарнула піякай работы сярод батрацтва і беднаты. У калгасе батрацка-бяднацкая група не арганізавана. Група беднаты, што існуе пры сельсавеце, працуе слаба. Паказальна, што ячэйка нават не прапрацавала пастановы ЦК УсеКП(б) аб рабоце сярод беднаты.

Натуральна, што пры такім стане работы сярод беднаты і батрацтва ячэйка ня здолела па-бальшавіцку кіраваць калгасным будаўніцтвам і падрыхтоўкаю да веснавой сяўбы. На гэтым вучастку дапушчаны сур'ёзныя недахопы і перагібы. У асобных вёсках калектывізацыя праводзілася мэтадамі націску. Некаторыя работнікі, замест папярэдняй работы сярод батрацка-бяднацкіх мас, займаліся адміністраваньнем. Бедняком і серадняком, якія ня ўступілі ў калгас, пагражалі: «Калі ня ўступіш у калгас—будзе дрэнна». Такія пагрозы лілі ваду на млын ворагаў калектывізацыі. Кулацтва разгарнула ўзмоцненую антысавецкую прапаганду, скарыстоўваючы ў сваіх інтарэсах кожнае галавацяпства мясцовых работнікаў. У выніку ў вёсцы **Калодліва** 60 беднякоў і сераднякоў падалі заявы аб выхадзе з калгасу. Ячэйка на гэтыя факты не рэагавала.

Партыйная ячэйка слаба мабілізавана на барацьбу с супраціўленьнем кулацтва. Асобныя партыйцы прымірэнча настроены ў адносінах да кулака. У сельсавеце цэлы рад кулацкіх гаспадарак не раскулачаны.

Камуністыя не правялі своечасова растлумачальнай работы сярод батрацтва і бяднацка-серадняцкіх мас па папулярызацыі артыкулу тав. Сталіна. 18 камуністых і 30 камсамольцаў, якія ёсьць у Бялынкавічах, не растлумачылі калгаснай масе сутнасьці прыкладнага статуту с.-г. арцелі.

Затое шырокую «растлумачальную» работу разгарнулі кулацкія «агітпроны».

Дрэнная справа і з падрыхтоўкаю да веснавое сяўбы. У гэтым напрамку ячэйка недапушчальна адстае. Сельсавет не гатовы да выхаду ў поле. Яравы клін не адведзен. Рабочы плян сяўбы ня складзен. Заданьне на насенных фондах выкапана толькі па 40 проц.

Парт'ячэйка заспула на сваім баявым і адказным пасту.

Брыгадзір «Зьвязды» ВОІНАЎ.

Праваапартуністычная практыка

У Багушэўскім раёне, **Аршанскай** акругі, работа сярод батрацтва і беднаты настаўлена вельмі кепска.

У арганізацыі мае месца праваапартуністычная недаацэнка работы сярод батрацка-бяднацкіх мас.

Большасьць партыйных ячэек ігнаруе пастановы партыйных органаў па пытаньнях работы сярод батрацтва і беднаты. У гэтым напрамку пяршынства атрымалі **Новасельская, Клюкаўская, Астапінская і Лядневіцкая** ячэйкі. Камуністыя гэтых ячэек палец аб палец ня стукнулі, как павесьці сыстэматычную арганізатарскую работу сярод батрацтва і беднаты.

Ня дзіва, што частка беднаты, з'агітаванай кулацтвам, выступае супроць калектывізацыі. Мясцовыя-ж работнікі-камуністыя не растлумачваюць беднапце сутнасьці калектывізацыі, займаючыся папікёрскім хныканьнем з прычыны адмовы часткі беднаты ўступіць у калгасы.

Раённы партсход рашуча асудзіў недаацэнку і пасьўнасьць асобных парт'ячэек у рабоце сярод батрацтва і беднаты. Былі прыняты рэзкія канкрэтныя пастановы па гэтым пытаньні.

Партыйнай арганізацыі трэба праверыць, наколькі гэтыя пастановы праведзены ў жыцьцё.

ГІРО.

Вынік дрэннай перабудовы

Партыйная арганізацыя **Лёзьнянскага** раёну суцэльнай калектывізацыі ня выканала дырэктыў партыі па пытаньнях росту.

Арганізацыя расьце зусім слаба. За год прынята ў партыю ўсяго некалькі батракоў і беднякоў. Частка ячэек за апошні год ня вырасла ні на аднаго чалавека. Не расьце зусім **Заольшанская** парт'ячэйка, ня гледзячы на наяўнасьць вялікіх кадраў с.-г. рабочых, чыгуначнікаў і батракоў. Гэта не прапашкаджае сакратару ячэйкі гаварыць аб «поўнай адсутнасьці» базы для росту.

Раённая камсамольская арганізацыя налічвае звыш 300 камсамольцаў. Аднак, рост партыйнай арганізацыі за лік камсамольцаў адсутнічае. Парт'ядро ў камсамоле складае толькі з проц.

Адсутнасьць росту сьведчыць аб слабой і нездавальняючай перабудове работы мясцовай партарганізацыі.

У. ТАМІЛІН.

ПЕРАВЫБАРЫ БЮРО ЯЧЭЕК

На мясцох разгарнулася справаздачна-перавыбарчая кампанія. Чакаем дакладных карэспандэнцый вестак аб ходзе перавыбараў

Перавыбары бюро ячэйкі КП(б)Б **вагонных майстэрань (ст. Менск)** ператварыліся ў шырокі агляд усёй работы парт'ячэйкі.

На сходзе прысутнічала звыш 200 беспартыйных рабочых, што сьведчыць аб добрай падрыхтоўцы да перавыбараў.

Камуністыя і беспартыйныя рабочыя, якія выступалі ў спрэчках, падкрэсьлілі, што партыйная ячэйка зусім не кіравала сацыялістычным спаборніцтвам. Ячэйка нічога не зрабіла, каб узмацніць і разгарнуць ударны рух на прадпрыемстве. Ударныя брыгады ў вагонных майстэрнях працавалі без усялякага кіраўніцтва.

Бясспрэчна, адным з асноўных недахопаў у рабоце ячэйкі зьяўляецца нездавальняючае палітычнае выхаваньне рабочай масы.

Пасьля сход заслухаў інфармацыю аб скажэньні партыйнае лініі ў правядзеньні перавыбараў парторганаў Касьтрычніцкай арганізацыі. Ячэйка цалкам і поўнасьцю далучылася да пастановы бюро Менскага АК КП(б)Б па гэтым пытаньні.

У часе выбараў бюро беспартыйныя рабочыя прынялі актыўны ўдзел у абгаварэньні кандыдатур у склад бюро. Многія рабочыя выступалі з правільнай крытыкай асобных партыйцаў, якія па тых ці іншых прычынах ня варты быць выбранымі ў склад бюро парт'ячэйкі. На першым-жа пасяджэньні новага бюро было зьмеркавана пытаньне аб перабудове работы. Зараз у ячэйцы арганізавана 10 сэктараў па розных галінах партыйнамасавае работы.

***

18-га сакавіка адбыліся перавыбары бюро партыйнага калектыву друкарні імя **Сталіна (Менск).** На перавыбарчым сходзе з дакладам аб чарговых задачах партарганізацыі выступіў прадстаўнік Фрунзаўскага РК КП(б)Б **т. Пятушкоў.**

Таварышы, якія выступалі ў спрэчках па дакладу т. Пятушкова, спыніліся на канкрэтных недахопах у рабоце партыйнага калектыву друкарні. Склад новага бюро партыйнага калектыву абноўлены на 65 проц. Сакратаром бюро выбраны т. Каждан. **Д—н.**

Галава трупу, які разлагаецца

Зараз, калі закончыўся допыт Яфрэмава, правадыра і арганізатара «СВУ», «БУД» і «СУМ»—гэтых пляцовак польскага фашызму на тэрыторыі Савецкай Украіны—перад намі ва ўсю велічыню ўстае вялізарны малюнак здрадніцтва і распродажу краю па часьцях замежнаму капіталу, лёс калёніяльнага прыволіцтва, які рыхтаваўся мацёрымі контр-рэвалюцыянэрамі з «СВУ» для працоўных мас вольнай Савецкай Украіны. Адначасова на ўвесь рост устае перад намі і аблічча правадыра гэтай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі—акадэміка Яфрэмава.

Зьяўляючыся прадстаўніком недабіткаў украінскай контр-рэвалюцыі, якіх пралетарыят бруднаю мятлою вымеў з межаў Савецкага Саюзу, Яфрэмаў, аднак, не злажыў зброі. Залізаўшы свае раны, ён праз некаторы час варочаецца назад у Савецкую Украіну з тым, каб зноў пачаць барацьбу з ненавіснай яму ўладай рабочых і сялян, але ўжо не адкрытую барацьбу, а сапаную, падрыўную. Злоўлены на месцы злачынства і прынёрты да сьцяны пралетарскім судом,—у яго, аднак, не хапае грамадзянскай смеласьці, мужнасьці наглядзець праўдзе ў вочы і перад тымі працоўнымі масамі, якіх ён зьбіраўся прадаваць, дзе якіх рыхтаваў путы ніволі—назваць рэчы іх уласнымі імёнамі. Гэты мацёры контр-рэвалюцыянэр рознымі спосабамі стараецца схаваць сваю воўчую прыроду і захаваць хаця-б выглядзьнасьць змаганьніка за «незалежную Украіну». Таму ён і трымаецца на судзе дзядоўскай тактыкі: «Хто яго ведае», «можа так, а можа не»...

Прызнаўшыся на папярэднім следзтве на ўсіх сваіх злачынствах, на судзе ён стараецца рознымі спосабамі ўхіліцца ад простых і ясных адказаў прадстаўніку пралетарскага суду. Але гэта яму не ўдаецца. З мэтаю затушаваць, згладзіць уражаньне ад сваёй контр-рэвалюцыйнай работы,—Яфрэмаў—гэты правадыр і арганізатар «СВУ», «БУД», правадыр партыі украінскіх сацыялістых - фэдэралістых, які гапарыцца сваёю 39-гадоваю палітычнаю дзейнасьцю, на судзе раптам прыкідваецца, што ён нічога ня памятае «можа так было, а можа не». Ён забывае Варшаўскі дагавор, пра ведае дагавору, падпісанага Антантаю, з аднаго боку, і прадстаўнікамі контр-рэвалюцыйных урадаў Дону, Беларусі і Украіны—з другога, таго дагавору, які быў падпісаны яго таварышом па партыі—Марголіным. Яфрэмаў ня ведае і дагавораў паміж Пятлюрай і Урангелем, Пятлюрай і дзянікінцамі, дагавору паміж галіцыйскай арміяй і Дзянікіным. Адным словам, ён не прыпамінае ўсёй тэй контр-рэвалюцыйнай работы, якая вялася на міжнароднай арэне так званым урадам «УНР», правадырамі «СВУ», «БУД» і украінскімі сац.-фэдэралістымі.

Больш таго, ён ледзь прыпамінае зьмест сваёй прамовы, якая была сказана пры ўрачыстым уезьдзе Пятлюры разам з белапалякамі ў Кіеў і якую ён закончыў воклічам: «За працьвітаньне нашай сяўбіцы, вялікай Польшчы—слава». Пры гэтым аркестр адыграў «Яшчэ Польска ня згінэла».

Украінскія дробна-буржуазныя партыі, як меншавікі, сацыялістыя-фэдэралістыя—гэтыя лёкаі буржуазіі, таксама як і нашы дамаросныя беларускія дробна-буржуазныя кулацкія партыі, якія зараз зьліліся з польскім фашызмам і сталі яго агентурай, толькі **пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі адразу абвяшчаюць сябе незалежнікамі.**

Пры царызьме-жа і пасьля лютаўскае рэвалюцыі яны выступалі супроць незалежнасьці і толькі пасьля перамогі пралетарскай рэвалюцыі выступаюць з лёзунгам «незалежнасьці» (аб якой тут «незалежнасьці гаворыцца—добра вядома), выступаюць за ўстанаўленьне панаваньня буржуазіі, за фэдэрацыю з буржуазнымі краямі. І вось Яфрэмаў —заснавальнік партыі украінскіх сацыялістых-фэдэралістых, яе правадыр—зараз на судзе нават «ня ведае», калі яго партыя стала на пазыцыі незалежнасьці (ад савецкай улады).

Яфрэмаў саромецца нават прызнаць сваю сувязь з бандытызмам, з яго галаварамі, як Ангелам, Гаевым, Лазавіком і інш., хаця не адмаўляе таго факту, што «даваў ім параду і забясьпечваў грашыма».

Прыкідваючыся цяпер тым, што нічога не памятае, гэты агент польскага фашызму ў сваёй барацьбе за дыктатуру буржуазіі, у барацьбе за зьвяржэньне савецкай улады патрабаваў **«ня спыняцца ні перад якімі рэпрэсыўнымі мерамі, хаця-б для гэтага прышлося зьнішчыць і мільёны камуністых».**

Але гэты партрэт Яфрэмава, зроблены на падставе яго толькі афіцыйных паказаньняў, будзе няпоўным, калі не дадаць сюды яшчэ некалькі штрыхоў з яго дняўніка, дзе ён запісваў свае пачуцьці, перажываньні, уражаньні—адным словам «гаварыў сам з сабою». Старанна і акуратна ён кожны месяц з году ў год запісвае «паказальнікі» таго эканамічнага «развалу», «катастрофы» Савецкага Саюзу, якіх ён так чакаў, якія ўзмацнялі яго веру ў сваю справу —у справу зьвяржэньня савецкай улады.

22 лютага 1925 году ён пісаў: «Па горадзе ходзяць чуткі пра падзеі ў Донбасе. Гаворыць, што там з прычыны надмернай здабычы вугалю скарочана 10.000 гарнякоў. Тады рабочыя, якія засталіся на працы, абвясьцілі забастоўку і пачалі ламаць машыны. Было выслана войска, якое адмовілася ўжыць зброю супроць рабочых. Паслалі камсамольцаў, але іх рабочыя загналі ў капальні і патапілі. Загінула 400 чалавек. Тады былі пасланы часьці «асобага прызначэньня»—камуністыя, якія і расстралялі рабочых».

Праз 10 дзён ён пісаў: «Па горадзе ходзяць якіясьці чуткі пра разрухі ў Маскве, што адбываюцца на грунце цяжкай эканамічнай дэпрэсыі і незадаволеньня афіцыйным камуністычным курсам. Гаворыць, што незадаволеньне асабліва наглядаецца сярод войска».

На падставе гэтых-жа «чутак» ён 1-га студзеня 1926 году ўжо пісаў наступнае: «Адным годам мы бліжэй сталі да разьвязк тэй глыбокай драмы, якая цягнецца над нашым нашчасным краем вось ужо восьмы год. Шмат ёсьць адзнак гэтаму... Кожны год, які адыходзіць у мінулае, усё тужэй зацягвае пятлю на іх шыях і набліжае час вызваленьня».

Другім важным фактарам, які акрыляў надзеі акадэміка на ажыцьцяўленьне яго імкненьняў, зьяўлялася пагроза імпэрыялістычнай вайны. Чуткам пра вайну ў яго дняўніку было адведзена значнае месца: «Зноў чуваць пра вайну на вясну з кааліцыяй дзяржаў—напередадзе маюць выступіць Польшча і Румынія. Настрой сярод камуністых, кажуць, прынечаны».

Пястуючы думку аб вайне, як сродку «вызваленьня Украіны з-пад савецкай улады», Яфрэмаў в вялікай сымпатыяй адносіўся да ўсіх тых, хто мог выкліканць яе. Таму, калі ў горадзе зьявіліся чуткі аб забойстве Пілсудскага ў Варшаве, Яфрэмаў надзвычай затурбаваўся і вось што пісаў у сваім дняўніку:

«Зранку пранеслася па горадзе чутка, што ў Варшаве забіты Пілсудзкі. Наводзілі спраўкі ў рэдакцыі «Пролетарской Правды». Там сказалі, што такія весткі маюцца, але яны не праверены... Калі гэта праўда, дык вынікі могуць быць вялізарныя. Гэта-ж кіраўнік дзяржавы, і да таго-ж дзяржавы, якая шукае толькі прычын да вайны, дзяржавы, за якою стаіць Англія, каторая любіць браць «мёртваю хваткаю» і якая, калі пачне справу, дык мае звычай даводзіць яе да канца. Так што, калі гэта праўда, дык мы стаімо на дарозе вялікіх надзей, вынікі якіх трудна і аблічыць... Завіруха быць можа бліжэй, чым мы думаем». (5 лютага 1927 году).

Асабліва шмат месца адвёў у сваім дняўніку Яфрэмаў забойству Пятлюры, на якога, як на «носьбіта нацыянальнай ідэі» пакладаў вялікія надзеі. Сьпярша Яфрэмаў не хацеў верыць у сьмерць Пятлюры. Калі-ж весткі пацьвердз

РАШУЧА ЎДАРЫМ ПА ГАЛАВАЦЯПАХ

Выпраўленьне перагібаў выклікае прыліў беднякоў і сераднякоў у калгасы

Барацьба са скажэньнямі ў калгасным будаўніцтве—удар па кулацтве і апартунізьме

Новы статут с.-г. арцелі

з здавальненьнем прыняты асноўнымі масамі сялянства

На глебе статуту зазначаецца прыліў у калгасы беднякоў і сераднякоў

Тыя перагібы, тыя шматлікія выпадкі галавацянства, адміністраваньня зьверху, якія мы сустракалі ў галіне арганізацыі калгасаў і якія былі толькі на руку нашаму клясаваму ворагу, даюць зара свае адмоўныя вынікі — у некаторых мясцох мы бачым распаўзаньне некаторых арганізаваных калгасаў. Але ў той самы час мы ў апошнія дні пачалі заўважваць і адваротныя зьявішчы — пасьля кароткага пэрыяду распаду часткі калгасаў пачынаецца новая хваля імкненьня ў калгасы і прыліву туды бядняцкіх і сярэдняцкіх сялянскіх мас.

Новы статут сельска - гаспадарчай арцелі ўсюды зрабіў на сялянскія масы самае добрае ўражаньне: сяляне на сходах, вывучаючы і камэнтуючы кожны пункт, знаходзяць гэты статут жыцьцёвым і зусім ужытным. Распачатая актыўная барацьба з усякімі праяўленьнямі адміністраваньня і прымусу ў калгасным руху, арганізацыя калгасаў з поўным улікам мясцовых умоў, на пачатках поўнай добраахвотнасьці, улілі ў асноўныя масы сялянства новы струмень бадзёрасьці і замацоўваюць іх волю да сапраўднай, сур'ёзнай калектывізацыі.

Мы тут падамо рад фактаў з практыкі Дубровенскага раёну (Аршаншчына), які адлюстроўваюць і цацьвярджаюць сказанае намі вышэй .

У Будаўскім сельсавеце разьмер калектывізацыі, штучна павялічаны амаль што да 100 проц., з прычыны распаду раду калгасаў, рэзка зьнізіўся амаль што да 25-30 проц. На адлёе часткі калгасьнікаў, апрача іншых прычын, яшчэ адбілася наяўнасьць у гэтым сельсавеце вялікай колькасьці адыходнікаў, якія думалі, што з уступленьнем у калгас яны будуць пазбаўлены сваіх заработкаў ад промыслаў на старане. Тут як і ва многіх іншых мясцох, дала сябе адчуць неарганізаванасьць промыслаў на старане сярод калгасьнікаў і адсутнасьць вычарпальнага і аўтарытэтнага растлумачэньня таго, што ўступленьне ў калгас ніякім чынам не перашкаджае гэтым промыслам — паадварот, для правядзеньня розных дзяржаўных і грамадзкіх работ мы ў першую чаргу будзем прыцягваць калгасьнікаў-адыходнікаў.

Але ў апошнія дні пасьля пэрыяду распаду мы ў гэтым самым сельсавеце заўважваем новы прыліў сялян, якія жадаюць уступіць у калгас — заявы падаюцца адна за аднэй.

У Нова - Тухінскім сельсавеце арганізаваны калгас пачаў быў разваливацца — з 120 двароў у ім засталося ўсяго 38, пераважна бядняцкіх. Але вось мінула тыдняў паўтара, і сяляне, азнаёміўшыся з новым статутам, зноў густа пайшлі ў калгас, які зараз ужо налічвае 65 проц. усіх двароў. Калгас, арганізаваны на плошчы 700 гэктараў, зараз ужо зямляўпарадкаваны і мае ўсе падставы ператварыцца ў здаровую калектыўную гаспадарку.

Усе гэтыя факты нам гавораць аб наступным. Калгасы моцныя там, дзе яны былі створаны натуральным шляхам з улікам мясцовых умоў, на пачатках поўнай добраахвотнасьці. А там, дзе мы назіралі распад, распаўзаньне штучна створаных папяровых, мёртванароджаных калгасаў, зараз на глебе новага статуту, добра ўсьвядомленага і са здавальненьнем прынятага асноўнымі масамі сялянства пачынаецца новы прыліў у калгасы бядняцтва і лепшай актыўнай часткі сераднятства. І тыя адпоўленыя калгасы, якія зараз ствараюцца, замест тых, якія разваліліся, маюць тэндэнцыю ператварыцца ў здаровыя, моцныя калектыўныя гаспадаркі з адданым, актыўным ядром калгасьнікаў.

Л. Н—даў.

Да чаго прыводзяць прымірэнчыя адносіны да кулака

У Талачынскім раёне (Аршаншчына) некаторыя паасобныя мясцовыя працаўнікі адносяцца прымірэнча да кулакоў. У выніку, кулакі пралезьлі ў некаторыя калгасы і дэзарганізуюць іх работу. У в. Рыжыцы, Азярыцкага сельсавету ў праўленьне калгасу «Шлях Леніна» трапілі кулакі. Яны першымі разбазарылі сваю жывёлу і маемасьць. Беднаты ў калгасе адціхнулі на задні плян. Беднякі ня маюць ўплыву на гаспадарку. Сярод беднаты ніякай растлумачальнай работы не вядзецца, групы беднаты пры калгасе таксама няма. Калі беднякі выступаюць і паказваюць на непаладкі ў калгасе, дык заможнікі і кулакі—члены праўленьня не даюць ім гаварыць і пагражаюць.

Ня дзіва, што ў такім калгасе, дзе ўсім запраўляюць кулакі, дзе ніякая растлумачальная работы не вядзецца—беднякі і сераднякі адмовіліся абагуліць сваё насеньне і жывёлу.

Што-ж зрабілі мясцовыя працаўнікі? На беднякоў і сераднякоў, якія не абагулілі сваё насеньне і жывёлу, былі складзены акты, апошнія былі пераданы ў Талачынскі райвыканком.

Загадчык земчасткай Талачынскага райвыканкому, замест таго, каб выправіць дапушчаныя працаўнікамі сельсавету памылкі, напісаў рэзалюцыю: «Арыштаваць і зрабіць паказальны арацэс».

Зразумела, такая «калектывізацыя» толькі прыносіць шкоду калгаснаму будаўніцтву і дыскрэдытуе яго.

Мы патрабуем, каб неадкладна была праведзена чыстка калгасу «Шлях Леніна» ад кулацкіх элемэнтаў. Мясцовыя працаўнікі, вінаватыя ў скрыўленьні клясавай лініі і палітыкі партыі, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Упарта ня выконваюць дырэктыў партыі

У Лепельскім раёне, Полацкай акругі, мясцовыя працаўнікі зварачаюць вельмі мала ўвагі на замацаваньне арганізаваных калгасаў. Пры калгасах дагэтуль яшчэ не арганізаваны групы беднаты і батрацтва. Растлумачальная работа пры арганізацыі калгасаў вялася вельмі слаба, асабліва сярод беднаты і жанчын. Калгасьнікам не растлумачвалі пра арганізацыю працы ў калгасе і не аплату.

У в. Забалацьці з прычыны адсутнасьці ўсялякае растлумачальнае работы сярод сялян у праўленьне калгасу абралі такіх людзей, якія праз тыдзень выпісаліся з калгасу. Пры паўторных выбарах у праўленьне не папалі беднякі, затое трапілі падкулачнікі. Беднота не арганізавана, сярод яе не вядзецца ніякай работы. Гэта становішча выкарысталі кулакі і падкулачнікі і навялі сыстэматычную агітацыю сярод калгасьнікаў за зваротку кулагом адабранай ў іх маемасьці, за разбор абагуленага насеньня і інвэнтару.

6-та сакавіка праўленьне калгасу пастанавіла лічыць калгас ліквідаваным. Назаўтра член сельсавету, не-калгасьнік, склікаў сход вёскі, на якім пад націскам заможнікаў і падкулачнікаў пастанавілі разабраць насеньне і вярнуць кулаком канфіскаваную ў іх маемасьць. Члены праўленьня першыя забралі сваіх кароў і насеньне. Канфіскаваная кулацкая жывёла кармілася бядняцкім кармом (у кулакоў корму не адабралі). Зараз, калі разабралі ўсю жывёлу, бядняцкія гаспадаркі засталіся бяз корму.

Кулакі вялі сваю работу па разлажэньні калгасу на працягу некалькіх тыдняў, але раённыя арганізацыі аб гэтым нічога ня ведалі. Раённыя працаўнікі лічылі, што калі калгас арганізаваны, значыць справа скончана, і больш аб ім не клапаціліся.

Мясцовыя працаўнікі ўпарта ня выконваюць дырэктыў партыі. Замест арганізацыі беднаты і батрацтва, замест растлумачальнай работы сярод сялян і асабліва сялянак аб сутнасьці калектывізацыі і замест сапраўднай работы на замацаваньні калгасаў, мясцовыя працаўнікі зноў займаюцца адміністраваньнем. Трэба рашуча спыніць прыпыбеэўскія мэтады ў калгасным будаўніцтве.

Брыгадзір «Зьвязды» МІНОВІЧ.



Уцягненьне батракоў у калгасы ідзе вельмі марудна

ЦК КП(б)Б пастанавіў, каб да пачатку веснавой сяўбы ў калгасы было ўцягнута каля 60.000 батракоў. Досыць выразныя дырэктывы партыі ўскладалі адказнасьць за іх выкананьне на мясцовыя арганізацыі.

Як-жа на справе выконваецца гэта дырэктыва партыі? Фактычна дагэтуль па БССР уцягнута ў калгасы каля 20.000 батракоў. Да пачатку сяўбы засталося вельмі мала часу. Каб выканаць дырэктыву ЦК КП(б)Б, неабходна ўцягнуць у калгасы яшчэ 40.000 батракоў. Між тым, калгассаюзы не паставілі ва ўсю шырыню гэтага пытаньня. Інструктары для правядзеньня гэтай работы яшчэ ня вылучаны. У выніку ў некаторых мясцох ня прымаюць у калгасы батракоў. У Калодзішчанскім сельсавеце, Менскае акругі, адмовілі ў прыёме ў калгас батрачцы Ерохавец Хрысьціне, быццам з-за адсутнасьці для яе працы ў калгасе. У калгасе «Камунар», куды яна была накіравана, ёй адказалі: «Нам патрэбна мужчынская рабочая сіла, а не жанчыны». У некаторых мясцох былі выпадкі адмаўленьня ў прыёме ня толькі батрачак, але і батракоў.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што ў раёнах і акругах дырэктыва партыі аб арганізацыі батрацка - бядняцкіх груп і аб уцягненьні батракоў у калгасы не знайшла належнага адбітку. Нізавыя партыйныя арганізацыі павінны сур'ёзна ўзяцца за гэту справу. Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб арганізацыі груп беднаты і ўцягненьні батракоў у калгасы павінны быць выкананы.

Л. КІСЯЛЁЎ.

Нявыкананая дырэктыва

Неразьбярыха і блытаніна ў пытаньнях шэфства рабочых над савецкім апаратам

Адным з найлепшых форм масавага кантролю і прыцягненьня шырокіх рабочых мас да дзяржаўнага кіраўніцтва зьяўляецца шэфства рабочых прадпрыемстваў над савецкімі ўстановамі. Практыка гэтай работы ў іншых гарадох СССР зусім сябе апраўдала.

Здавалася-б, што ідэя шэфства прадпрыемстваў над савецкім апаратам павінны былі быць у нас шырока падхоплены. Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што партыйныя, прафэсыянальныя і савецкія арганізацыі вельмі мала ўвагі зварачаюць гэтаму пытаньню.

ЦКК-НК РСІ сабрала матар'ялы чатырох арганізацый (ЦСПСВ, Мен. АК КП(б)Б і двух райкомаў гораду) аб шэфстве над савецкімі ўстановамі. Прыходзіцца канстатаваць, што ў нералічаных арганізацыях няма ўзгодненасьці па пытаньнях шэфства, што існуе поўная блытаніна ў арганізацыйнай пабудове шэфства.

У сувязі з веснавой пасеўнай кампаніяй праведзена рэарганізацыя шэфскіх таварыстваў на весны па вытворчым прынцыпе—вытворчыя саюзы бралі шэфства над вясковымі раёнамі; да іх-жа прымацоўваліся нявытворчыя саюзы. На аснове гэтага прынцыпу асобныя прадпрыемствы бралі шэфства над установамі, якія разам з імі шэфствавалі над вясковымі раёнамі. Гэта структура праведзена бяз санкцыі ЦК КП(б)Б і была толькі ўзгоднена з Мен. АК КП(б)Б.

Райкомы гораду, як відаць, не зразумелі гэтай структуры, а можа прызналі яе прымэтазгоднай і правялі пасвойму прымацаваньне прадпрыемстваў да ўстаноў. У выніку атрымалася поўная неразьбярыха ў пытаньнях шэфства. Над аднэй установай бралі шэфства разам два прадпрыемствы. Адна фабрыка, па згодзе райкому, брала шэфства над установай, а саюз не згаджаўся з гэтым і прымацоўваў да фабрыкі іншую савецкую ўстанову. Рабочая брыгада, якая пачынала ўжо знаёміцца з работаю савецкага апарату, павінна была кінуць гэту работу, патраціўшы даремна некалькі дзён. Невядома, хто адказвае за гэту работу—ЦСПСВ спасылаецца на райкомы, а райкомы на ЦСПСВ. Пакуль што дырэктыва адносна шэфства над савецкім апаратам застаецца нявыкананай.

Мы лічым, што ў самым хуткім часе трэба зрабіць пералом у галіне шэфства прадпрыемстваў над савецкімі ўстановамі.

М. Ч.

****

Па БССР

ПРЫГАРАДНАЯ КААПЭРАЦЫЙНАЯ ГАСПАДАРКА

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). ЦРК арганізуе каля вёскі Ляшчынец прыгарадную калектыўную гаспадарку, у якой пад агароды адводзіцца 130 гэкт., пад збожжавыя і тэхнічныя культуры—300 гэкт. і пад сенажаці і інш. ужыткоўнасьці—900 гэкт. Для працы на гэтай гаспадарцы ЦРК арганізуе ўласную машынаконную калёну. Ужо набыта 60 проц. патрэбнага насеньня для сяўбы. Пры гаспадарцы будзе адкрыта малочная ферма.

ДРЭННА З ВЫВАЗКАЙ ЛЕСУ

ВОРША. (Наш кар.). Аршанскія лесазагатоўчыя арганізацыі выканалі плян загатовак лесу на 103 проц. Лепш за ўсіх выканаў свае заданьні аршанскі вучастак Лесбелу—на 118 проц. Адстае Багушэўскі вучастак, які выканаў заданьне па загатоўцы дроў толькі на 24 проц.

Зусім дрэнна пастаўлена вывазка загатоўленай драўніны. Усяго па акрузе заданьне па вывазцы будаўнічага матар'ялу выканана на 60 проц., а па вывазцы дроў—на 40 проц.

НА 7-МІГАДЗІННЫ ДЗЕНЬ

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). З 15-га сакавіка рабочыя службы цягі Віцебскага чыгуначнага вузла перайшлі на 7-мігадзінны рабочы дзень. Усяго на вузле праведзена на 7 гадзін працы 1660 чыгуначнікаў. У дзень пераходу рабочыя абяцалі ўзьняць працдысцыпліну і павялічыць прадукцыйнасьць працы на 14 проц.

ШУЛЬМАН.

Жлобінскія чыгуначнікі сабралі ў фонд капектывізацыі 13 тысяч рублёў

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Жлобінскія чыгуначнікі правялі вялікую працу па зборы сродкаў у карысьць калектывізацыі. За апошнія тры месяцы імі сабрана ў гэты фонд 13 тысяч рублёў. На гэтыя грошы закупляюцца для калгасаў сельска - гаспадарчыя машыны і трактары. Збор сродкаў праходзіў шляхам паладжаньня нядзельнікаў, шляхам адлічэньняў ад заработнае платы і г. д.

Замах на актывістага-калгасьніка

САМАХВАЛАВІЧЫ. (Наш кар.). У вёсцы Кайкава, Самахвалавіцкага раёну, быў зроблен замах на члена праўленьня калгасу імя Будзённага тав. Лазарчыка Міхася. Тав. Лазарчык зьяўляецца актыўным вясковым работнікам. Некалькі раз выбіраўся членам Кайкаўскага сельсавету, прымаў шчыры ўдзел у працы рабочае брыгады па абагуленьні збожжа.

Шяныя кулакі Матрунчыкі Даніла і Янка заклікалі Лазарчыка да сябе ў хату і з крыкам: «усім абагульнічыкам так будзе» пачалі зьбіваць яго, пакуль ён ня страціў прытомнасьці.

Кулакі затрыманы. Калгасьнікі патрабуюць паказальнага суду над кулакамі ў вёсцы Кайкава.

Супроць нэйтральнасьці і апалітычнасьці

ДУБРОЎНА. (Наш кар.). Гэтымі днямі адбылася канфэрэнцыя настаўнікаў Дубровенскага раёну. Галоўнае пытаньне, якое сканцэнтравала наўкола сябе ўсю ўвагу настаўніцтва, — гэта правядзеньне калектывізацыі ў Дубровенскім раёне. Канфэрэнцыя рашуча выступіла супроць «нэйтральнасьці» і так званай «лёяльнасьці» асобных настаўнікаў у адносінах калектывізацыі вёскі. Канфэрэнцыя выявіла цэлы рад настаўнікаў, якія ня толькі не праводзілі ніякай працы па калектывізацыі, а паадварот займаліся шкодніцтвам, выступалі супроць калгасаў і трымалі сувязь з антысавецкімі элемэнтамі на вёсцы.

Самагоншчыкі—у калгасах

РУДЗЕНСК. (Наш кар.). У Рудзенскім сельсавеце арганізаваны калгас «Пралетары». Работа гэтага калгасу пастаўлена дрэнна. Праўленьне калгасу бязьдзейнічае. Замест дружнай калектыўнай працы пачало разьвівацца хуліганства і п'янства. Некаторыя калгасьнікі «Пралетара» пачалі займацца выганкай самагону. Так, самагоншчык Ц. Лабанок, які пралез у калгас, за два месяцы перагнаў на самагон аж 25 пудоў збожжа. Праўленьне калгасу, ня гледзячы на тое, што выганка самагону робіцца на яго вачох, ня прымае ніякіх мер для барацьбы з гэтым злом.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Узмацніць вытворчы націск

ПАКРЫЦЬ ПРАРЫВЫ ПЕРШЫХ 5-ці МЕСЯЦАЎ

Непаладкі на Бабруйскім камбінаце працягваюцца

Мы пядаўна сыгналізавалі аб радзе непармальнасьцяй у працы Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату. Прэзыдыум ЦКК-РСІ ухваліў па гэтым пытаньні спэцыяльную пастанову. Праўда, у галіне забесьпячэньня сырцом ёсьць сякія-такія дасягненьні. Камбінат зараз забясьпечаны запасам сырцу на тры тыдні. Кожны дзень па чыгунцы падаецца 25-30 вагонаў драўніны, што забясьпечвае сутачную патрэбу. Калі ў далейшым драўніна будзе так падавацца, дык камбінат здолее пратрымацца да спыненьня на рамонт і пачатку навігацыі.

Але рад іншых буйных непаладак і дасюль ня зьнішчаны. Яшчэ ня вырашана пытаньне з рабочай сілай. Не хапае кваліфікаваных рабочых. Склад дапаможнай рабочай сілы вельмі цякучы. У лютым зьмянілася каля 900 чалавек, прычым шмат з іх прапрацавалі толькі 1-2 дні.

Таксама не забясьпечаны рабочай сілай фанэрны цэх. Пастанова прэзыдыуму ЦКК аб неабходнасьці перакідваньня на фанэрны цэх кваліфікаваных рабочых з іншых прадпрыемстваў у жыцьцё не праведзена. Характэрна, што да апошніх дзён адміністрацыя фанэрнага цэху ня мела нават пастаяннага сьпісу рабочых цэхаў.

Становішча з запаснымі часткамі пастарому напружанае, хоць кіраўніцтва камбінату ня спыняе бамбардаваць цэнтр па гэтым пытаньні паперкамі. Асабліва востра стаіць пытаньне аб лінейках да шэльмашын, ляфэтаў да варштатаў. Ня гледзячы на шматлікія патрабаваньні, камбінат дагэтуль не атрымаў электра-цялежак і аўтаводу, які вельмі патрэбны камбінату.

Гэтыя пытаньні трэба тэрмінова вырашыць, каб упікнуць перабояў у рабоце. Камбінат чакае поўнага ажыцьцяўленьня пастаноў кіраўнічых органаў.

А. МАГІДАЎ.

ЛЕПШАЯ РАБОТНІЦА

Тав. ЮДЗІЛЕВІЧ Г.—брусоўшчыца Менскай абутковай фабрыкі.

Норма выпрацоўкі загатовак—547 пар у дзень, робіць 800 пар.

Замест работы—грызьня

Менская галянтарэйная фабрыка «Беларуска» за першую дзесяцідзёўку сакавіка па некаторых відах прадукцыі выканала вытворчую праграму з перавышэньнем: па вырабе галалітавых грабянёў—на 21,5 проц., па цалюлёзных грабянёх—на 14,1 проц.

Затое па пэрлямутравых гузіках праграма недавыканана на 23,9 проц., па палатняных гузіках—на 42,7 проц., а па галалітавых гузіках—недавыкананьне дасягнула рэкордная лічбы—52 проц.

Пытаньне аб работе галалітава-рогавага цэху гэтымі днямі стаяла на насяджэньні бюро партыйнай ячэйкі. Бюро канстатавала, што ніякіх аб'ектыўных прычын для недавыкананьня вытворчай праграмы ня было і што асноўнай прычынай зьяўляецца **дрэннае кіраўніцтва з боку майстроў гэтага цэху.** У цэху наглядаюцца вельмі частыя прастоі з прычыны паломак машын і несваячасовага рамонту іх. Ударная зьмена ніякай дапамогі з боку майстроў не атрымлівала. Машыны ня маюць запасных частак, што таксама выклікае частыя прастоі. Нарады на рамонт папсаваных машын даюцца праз некалькі дзён пасьля паломкі іх. Паміж асобнымі майстрамі ня было дагаворанасьці. Замест кіраўніцтва майстры паміж сабою грызьліся, звальваючы адзін на аднаго прычыны непаладак у цэху.

Бюро партыйнай ячэйкі паставіла пытаньне рубам: прамфінплян павінен быць выкананы і, калі майстры не палепшаць свае работы, ня прымуць канкрэтных мер для зьнішчэньня непаладак у цэху—паставіць пытаньне аб іх далейшай рабоце і партыйнасьці.

А. Н.

Прарыў першага кварталу не ліквідаваны

Завод імя Ланцуцкага ў Гомелі, які меў у першым квартале вялікі прарыў у выкананьні прамфінпляну, за два месяцы другога кварталу таксама ня выканаў прамфінпляну. Вагонны цэх, які павінен быў адрамантаваць у студзені і лютым 79 вагонаў, адрамантаваў толькі 63. Такім чынам, па вагонным цэху праграма рамонту пасажырскіх вагонаў выканана толькі НА 79,74 ПРОЦ. А калі ўлічыць зусім нявыкананую праграму па рамонце таварных вагонаў, то прарыў будзе яшчэ большым.

Крыху лепш абстаіць па цэху рамонту паравозаў: замест 18 паравозаў завод выпусьціў 19.

Дрэнна са зьнішэньнем сабекошту.

Насгул студзень і люты паказалі, што ня толькі не ліквідаваны прарыў першага кварталу, але ёсьць далейшае адставаньне у выкананьні прамфінпляну.

ПАЛЕСКІ.

ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ВЫКОНВАЮЦЦА ДРЭННА

Бабруйская гарадзкая канфэрэнцыя ўдарнікаў заслухала даклад аб выкананьні прамфінпляну за першыя пяць месяцаў бягучага гаспадарчага году. Амаль па ўсіх прадпрыемствах колькасныя паказальнікі выконваюцца ольш-менш добра, затое якасныя паказальнікі, асабліва зьніжэньне сабекошту і прагулаў, значна адстаюць ад пляну.

На камбінаце сабекошт прадукцыі перавышае плянавыя меркаваньні: па ўнутранай прадукцыі 5 проц., па экспартнай на 7 проц.

Сабекошт прадукцыі маслабойнага заводу імя Адзярыхі на 5 проц. вышэй пляну. Апалу расходуецца на 5 проц. больш чым вызначана плянам, сарэзту —на 16,6 проц. больш.

На мэблявай фабрыцы за першы квартал было 1.139 прагулаў, а за два месяцы 2-га кварталу—1.129. Выпрацоўка за апошнія два месяцы зьнізілася на 23,5 проц.

Чыгуна-ліцейны завод, які перайшоў на стандартную выпрацоўку прэсаў для цагелень, мае 9,5 проц. прагулаў.

У Бабруйскай друкарні таксама прагулы павялічыліся, дасягнуўшы 13 проц.

Усё гэта гаворыць пра тое, што рабочая маса яшчэ цалкам не мабілізавана для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Ударнікі яшчэ ня ўсюды працуюць паўдарнаму.

Канфэрэнцыя вызначыла рад мерапрыемстваў для выкананьня прамфінпляну ня толькі ў колькасных паказальніках, але таксама і ў якасных.

А. М.

ЛЕПШЫ РАБОЧЫ

Тав. ШЭЙНМАН—рабочы Эльводу, арганізатар першай ударнай брыгады моладзі, якая паставіла помпу замест звычайных 30 дзён праз 15 дзён.

600 ДАДАТКОВЫХ ТРАКТАРАЎ АТРЫМАЮЦЬ КАЛГАСЫ БССР,

калі выканаюць загатоўкі другараднага экспартнага сырцу

Давесьці плян загатовак да раёну, калгасу, прадпрыемства

У паход за трактар, за утыльсырэц

Агульная адсталасьць нашай сельскай гаспадаркі, нізкая ступень яе тэхнічнай базы не дае нам магчымасьці патрэбным тэмпам ператвараць нашы калгасы ў сапраўдную сацыялістычную машынізаваную вытворчасьць. Адсюль і задача, якая неадкладна стаіць перад партыяй і ўсёй грамадзкасьцю—знайсьці ўсе магчымасьці для максымальнага падняцьця тэхнічнай базы нашае сельскае гаспадаркі, даць калгасу трактар і складаныя с.-г. машыны.

Аднак, тэмп калектывізацыі абганяе тэмп вытворчасьці складаных с.-г. машын унутры нашай краіны, таму мы вымушаны частку трактараў і іншых машын яшчэ завозіць з-за мяжы. Гэта ў сваю чаргу выклікае неабходнасьць максымальна разьвіць наш экспарт, асабліва другараднага сырцу: утыльсырэц, рызьзя, касьці, шчаціны, конскага волосу, грыбоў, ягад і інш.

Саюзны ўрад выдаў нядаўна закон, на падставе якога ўвесь другарадны сырэц, які загатаўляецца ў калгасах асобнымі калгасьнікамі, ці грамадзкімі арганізацыямі залічваецца ў спэцыяльны імпартны трактарны фонд. Паводле мінімальных падлікаў у БССР ёсьць магчымасьць **накапіць гэты фонд на 600 трактараў.**

На жаль, да гэтага часу мы яшчэ не давялі да асобнага калгасьніка значэньня збору гэтых відаў сырцу і арганізаванай здачы яго каапэрацыйным, ці дзяржаўным загатоўшчыкам. Мы яшчэ не падняслі грамадзкасьці на барацьбу за трактар праз збор утылю ня толькі ў вёсцы, але і ў гарадох. Мы ў гэтым наваг адсталі ад іншых раёнаў Саюзу. З паступленьнем вясны нашы магчымасьці ў гэтай галіне асабліва ўзмацняюцца. Трэба хутка арганізаваць для поўнага скарыстаньня сэзону.

Трэба, каб камсамол мабілізаваў для гэтай работы ў гарадох тысячы камсамольцаў і піянэраў, трэба ўцягнуць жонак працоўных у гэту работу праз ЖАКТы.

Для БССР ужо выдзелена пакуль што авансам 12 трактараў. Яны будуць пераданы тым калгасам, якія змаглі ўцягнуць калгасную масу ў збор утылю.

Усім трэба памятаць, што трактары для калгасаў ёсьць, яны чакаюць экспартнага сырцу. Чым хутчэй мы возьмемся за гэту справу, тым хутчэй мы сапраўды выканаем лёзунг партыі за павышэньне тэхнічнай базы калгасаў. «У паход за трактар, за утыль-сырэц».

Абрамсон.

Калгассаюзы зрываюць збор утыльсырцу

Сёлета плян загатовак і экспарту другарадных відаў сырцу ў 2½ разы павялічаны, у параўнаньні з мінулым годам.

За 5 месяцаў бягучага гаспадарчага году плян загатоўкі другарадных відаў экспарту выкананы ўсяго на 85 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Горш за ўсё стаіць справа з загатоўкаю касьцей, плян па якіх выкананы ўсяго на 60 проц.

Зусім кепская справа са зборам рызьзя. Увесь збор рызьзя з посьпехам праходзіць у гарадох, па прадпрыемствах, а па вёсцы за апошні час наглядаецца значнае зьніжэньне збору. Зусім дрэнна праходзіць збор рызьзя ў калгасах. Калгассаюзы зусім не надрыхтаваны да правядзеньня загатовак утыльсырцу і ў той-жа час не дапускаюць іншых загатоўшчыкаў да работы па зборы утылю ў калгасах. Ёсьць рад выпадкаў, калі акрэкалгассаюзы анулююць дагавары, якія заключаны асобнымі калгасамі з Дзяржгандлем і іншымі загатоўшчыкамі. **У выніку калгасы не вядуць ніякай загатоўкі другарадных відаў сырцу і сацыялістычны сэктар вёскі нікім з загатоўшчыкаў не абслугоўваецца.**

Трэба адзначыць, што грамадзкасьць да гэтага часу таксама прымала вельмі слабы ўдзел да ўзмацненьні збору утылю ў дапамозе па выкананьні нашых экспартных плянаў. Ва многіх гарадох гарсаветы зусім ня цікавяцца і не дапамагаюць загатоўшчыкам выконваць свае экспартныя пляны.

Месячнік збору утылю, які праводзіўся камсамолам, ня даў тых вынікаў, якія маглі-б быць пры належнай пастаноўцы работы. Некаторыя райкомы ЛКСМБ (Мазырская акруга) нават ня ведалі аб тым, што па Беларусі праводзіцца месячнік збору утылю.

Пасьпяховае выкананьне пляну загатовак і экспарту другарадных відаў сырцу павінна стаць аднэй з асноўных задач сёняшняга дня. Трэба цьвёрда памятаць, што **калі толькі калгасы выканаюць свае загатоўчыя пляны па зборы рызьзя, то гэта можа даць БССР звыш 600 трактараў.**

Трэба, каб зборам утылю і іншых відаў сырцу зацікавіліся ўсе арганізацыі. У гарадох зборам павінны быць ахоплены ўсе прамысловыя і саматужныя прадпрыемствы. Гарсаветы, сумесна з жактамі, павінны арганізаваць збор утылю на ўсіх дварох шляхам устаноўкі спэцыяльных скрынь.

Да гэтага часу ня была разгорнута, як належыць, растлумачальная работа аб важнасьці збору ўтылю. Прафсаюзы, якія да гэтага часу ня прымалі ніякага ўдзелу ў зборы другарадных відаў сырцу, павінны пры ўсіх мясцкомах вылучыць спэцыяльных таварышоў, якіх-б адказвалі за гэту справу.

Яшчэ большую работу трэба правесьці па вёсцы. Кожны калгас павінен атрымаць цьвёрдае заданьне па зборы другарадных відаў сырцу. На дапамогу калгасам і паасобным сялянскім гаспадаркам павінны прыйсьці камсамольскія ячэйкі, сельсаветы, камітэты ўзаемаданамогі, школы і іншыя грамадзкія арганізацыі вёскі.

Другі і трэці кварталы зьяўляюцца рашаючымі месяцамі ў зборы утылю і ў пасьпяховым выкананьні нашых экспартных плянаў.

Усе арганізацыі павінны дапамагчы пасьпяховаму выкананьню нашых экспартных плянаў, дапамагчы трактарызацыі нашай сельскай гаспадаркі.

Трэба дабіцца поўнага выкананьня нашых экспартных плянаў.

А—с.

Пазыка трактарызацыі сельскае гаспадаркі

Усесаюзнае аб'яднальне аўтатрактарнае прамысловасьці выпусьціла мэтавую пазыку пад назвай «Пазыка садзейнічаньня трактарызацыі сельскае гаспадаркі».

Аблігацыі пазыкі аплачваюцца выключна за зданы ўтыльсырац. Грошы за аблігацыі паступаюць у асобны фонд, які прызначаецца для дадатковага завозу трактароў з-за мяжы. Пазыка выпускаецца на суму ў 25.000.000 рублёў, **прычым па БССР павінна быць рэалізавана аблігацый на суму ў 1.500.000 рублёў.** Пазыка выпускаецца тэрмінам на 3 гады. На працягу гэтых 3-х год будуць разыграны 3 тыражы пазыкі, прычым у кожным тыражы будзе разыграваца **30.000 выйгрышаў па 50 руб. кожны.**

Гэтымі днямі адбылася спэцыяльная нарада ў Дзяржбанку сумесна з прадстаўнікамі Велдзяржгандлю, Калгассаюзу, Паляводсаюзу і Белкаўчаюзу, на якой пазыка разьмеркавана паміж асобнымі акругамі.

Усе сродкі пазыкі пойдуць выключна на закупку трактараў для калгасаў.

МЯСЦОВЫЯ ГАЛАВАЦЯПЫ ЗРЫВАЮЦЬ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ КАЛГАСАЎ КОНЬМІ

Праз некалькі тыдняў пачнецца веснавая кампанія. Трэба ўдарна выхіпаць цягавую сілу. А ў нас многія калгасы і саўгасы ня маюць патрэбнай колькасьці коняй. Для калгасаў і саўгасаў Менскай акругі патрэбна каля 2.500 коняй. На сёняшні дзень Менакрмалжывсаюзам закуплена 420 коняй, г. зн., што яшчэ трэба звыш 2.000 коняй для поўнага забесьпячэньня веснавой сяўбы ў згаманджаным сэктары цягавай сілай.

Менскі малочны жывёлагадоўчы саюз зрабіў усё магчымае, каб закупіць коняй, але яму прышлося сутыкнуцца з галавацянствам раду мясцовых работнікаў, якія імкнуліся сарваць загатоўку коняй, забаранялі перакідку коняй з аднаго раёну ў другі. Вось рад прыкладаў.

Адзін з калгасаў Капыльскага раёну паведаміў, што ў яго ёсьць 500 лішніх коняй, якіх ён можа прадаць іншым раёнам, дзе коняй не хапае. У Плешчаніцкім раёне не хапае 520 коняй, у Бягомльскім—405, у Сьмілавіцкім—30, у Барысаўскім—175 і г. д.

Менакрмалжывсаюз паслаў свайго прадстаўніка ў Капыль для закупкі 300 коняй; адначасова зрабіў распараджэньне Сьмілавіцкаму райсаюзу , выслаць свайго прадстаўніка для куплі 200 коняй для машына-конных станцый. Але Капыльскі РВК не дазволіў купляць коняй. Толькі тады, калі прадстаўнік Малочна-жывёлагадоўчага саюзу ўказаў старшыні РВК, што калгас сам зрабіў заяўку на продаж 500 лішніх коняй і што апошнія ядуць у калгасе дарэмна корм, што ў Плешчаніцкім раёне ідзе загатоўка экспартнага матар'яду і вельмі патрэбна цягавая сіла,—старшыня РВК дазволіў прадстаўніку Плешчаніц купіць 300 коняй. Але разам з тым даў дырэктыву прадаць самых горшых нягодных коняй па надзвычай павышанай расцэнцы—замест 15 р.—150, замест 50 —190 руб.

Таксама адмёсься да гэтай справы старшыня **Койданаўскага РВК,** які забараніў раймалжывсаюзу купляць коняй для Бягомльскага раёну.

Акрмалжывсаюз у пачатку гэтага месяца зараз-жа рэагаваў на гэтыя адносіны і паведаміў прэзыдыум Менскага АВК і Белмалжывсаюз. Здавалася-б, што гэтыя арганізацыі зараз-жа прымуць меры, каб спыніць падобныя адносіны да забесьпячэньня калгасаў.

Але Менскі акрвыканком **зусім нядбайна адмёсься** да гэтага пытаньня і нічым не дапамог.

КРУЧКОВЕЦ.

Перавыбары заўкомаў мэталістых

Кампанія ўсё яшчэ ідзе марудна

Клюб новы, а працуе па-стараму

Клюб мэталістых мае вельмі прыемны знадворны выгляд. Яшчэ больш прыгожа ў сярэдзіне. Вялікая заля зьмяшчае больш 800 глядачоў. Акрамя таго, ёсьць маленькая заля для пасяджэньняў, 8 пакояў для заняткаў розных гурткоў і, нарэшце, габінэт загадчыка, на дзьвярах якога прыбіта таблічка з надпісам «праўленьне». Але таблічка ўводзіць наведвальнікаў у зман: ніякага праўленьня клюб яшчэ ня мае

Конкурс „Зьвязды“ на карэспандэнцкі аб лепшай і горшай сталоўцы

Умовы конкурсу

Для правядзеньня абвешчанага «Зьвяздою» конкурсу на карэспандэнцкі аб лепшай і горшай сталоўцы, пры цэнтральнай аглядавай камісіі грамадзкага харчаваньня вызначана журы, якое складаецца з т.т. Сяргеева (рэд. «Зьвязда»), Адлерштэйна (ЦКК РСІ), Мазалева (Белкаапсаюз), Васільева (ЦСПСБ) і Злотнікава (ЦП саюзу нархарч).

Да карэспандэнцкай па конкурсе прад'яўляюцца наступныя запатрабаваньні: кароткасьць, выразнасьць, ілюстрацыя фактамі. Карэспандэнцкія павінна паказваць, ці адпавядае лінія сталовая ў сучаснай сыстэме грамадзкага харчаваньня тым патрабаваньням, якія прад'яўляюцца да грамадзкага харчаваньня ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду, ці дапамагае сыстэма яе абслугоўваньня павялічэньню рэальнай зарплаты рабочых, укараненьню грамадзкага харчаваньня ў рабочы быт, ці наадварот. У карэспандэнцкі павінна быць выразна выказана роля і кіраўніцтва вышэйшай каапэрацыйнай арганізацыі.

У карэспандэнцкіях аб горшай сталоўцы павінны быць асьветлены моманты: бюракратызму адміністрацыі, засьмечанасьці апарату чужым і непрыстасаваным элемэнтам, дарагоўля і кепская якасьць прадукцыі, галавацяпскі ўнутраны распарадак, у выніку якога адрываецца і губіцца рабочы час, ствараюцца вялікія чэргі, непрыстасаванасьць сталовае да абслугоўваньня прадпрыемства, і паогул спажыўца, антысанітарны стан, асноўныя прычыны незадаваленьняў рабочага спажыўца і інш.

Аб лепшай сталоўцы — гібкасьць і прыстасаванасьць сталоўкі да хуткага і бесьперабойнага абслугоўваньня спажыўца, увязаная з вытворчым працэсам прадпрыемстваў. Процант рабочых і служачых прадпрыемства ці ўстановы, ахопленых грамадзкім харчаваньнем і як яно ўкараняецца ў быт, асабліва ў шматсямейных. Максымальнае зьніжэньне сабекошту і добрая якасьць прадукцыі, здаровы прытулак, добра пастаўлена гігіяніча-санітарная справа, чулы, працаздольны апарат і г. д.

Для прэміяваньня карэспандэнцкай устанаўляецца 6 прэмій, з іх 3 прэміі за карэспандэнцкі аб лепшай сталоўцы і 3—аб горшай.

Разьмеры прэмій: 2 першыя прэміі (за горшую і за лепшую) — па 300 руб., 2 другія прэміі — па 200 руб. і 2 трэція — па 100 руб.

Выплата прэмій праводзіцца цэнтральнай аглядчай камісіяй пры «Зьвязьдзе», паводле прысуду журы.

Усе карэспандэнцкі да конкурсу павінны быць за поўным і выразным подпісам, з азначэньнем месца службы, займаемай пасады і дакладнага адрасу. Прысылаюцца яны ў запячатаных канвэртах па адрасе: Менск, рэдакцыя «Зьвязды» «на конкурс па грамадзкім харчаваньні».

СЁНЬНЯ, 22-га сакавіка а 6-й гадз. увечары рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА“ склікае

нараду рабкораў, сьценкораў і рэдактароў насьценгазэт

прадпрыемстваў і ўстаноў з парадкам дня:

1. Як асьвятляць у друку ход агляду грамадзкага харчаваньня.
2. Аб удзеле рабкораў і рэдкалегій у чыстцы савецкага апарату і апарату МЦРК.
3. Бягучыя справы.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі газэты «Зьвязда».

Запрашаюцца прадстаўнікі ЦП НАРХАРЧ, МЦРК, Белрабсэкцыі і Белкаапсаюзу (асабіста т. т. Мірінгоф і Васільева—ЦСПСБ).

Рэдакцыя „ЗЬВЯЗДЫ“.

ЗА 40-ТЫСЯЧНЫ ТЫРАЖ „ЗЬВЯЗДЫ“!

Заданьне партыі аб 30-тысячным тыражы „ЗЬВЯЗДЫ“ выканана з некаторым перавышэньнем. Але зараз гэтага мала. Партыя расьце, расьце лік актывістых рабочых і калгасьнікаў. Разам з гэтым павінна ўзрастаць і колькасьць чытачоў „ЗЬВЯЗДЫ“— баявога органу ЦК КП(б)Б, які сваім кіраўніцтвам наблі-жае актывістага рабочага і калгасьніка да партыі.

У пэрыяд вялікіх тэмпаў рэканструкцыі народнае гаспадаркі і вялізарнага працэсу сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, у пэрыяд жорсткіх клясавых баёў не павінна быць ні аднаго партыйца, ні аднаго рабочага-актывістага, ні аднаго калгасьніка-актывістага без „ЗЬВЯЗДЫ“.

Упоўнаважаныя па падпісцы!

Разгарнеце зараз-жа работу па вярбоўцы новых кадраў падпісчыкаў сярод рабочых і калгасьнікаў. Арганізуйце доўгатэрміновую (гадавую і паўгадавую) падпіску ў цэху і калгасе.

Парт'ячэйкі, фабзаўкомы, праўленьні калгасаў!

Ваш абавязак — арганізаваць шырокую, доўгатэрміновую падпіску—забясьпечыць газэтай рабочага-кадравіка, рабочага-сэзоньніка і калгасьніка.

РАБСЕЛЬКОРЫ! Вы абавязаны быць першымі арганізатарамі і агітатарамі шырокай падпіскі на „ЗЬВЯЗДУ“.

Падпіска на „ЗЬВЯЗДУ“ на заводзе, будаўніцтве і ў калгасе— адно з важнейшых зьвеньняў агульнай баявой работы.

Ад Фрунзаўскага РК КП(б)Б

Дакладчыкамі ў яч. Фрунзаўскага раёну для правядзеньня дакладаў на тэму:—«Чарговыя задачы калектывізацыі на падставе апошніх дырэктыў партыі—вылучаюцца наступныя т. т.:

Ад Камвузу: Гімельфарб—да яч. зав. «Камунар», Сасвіт—яч. зав. «Дрэва-апрацоўшчык», Ярмолін—зав. «Пролетары», Аўчыньнікаў — ф-ка «Прагрэс», Лур'е—ф-ка «Акцябр», Выдра—кандытарская ф-ка, Вайнштэйн—галянтарэйная ф-ка, Белашэўскі—скарняжная ф-ка, Буткевіч—адд. хлебазаводу і Карнейчык—п.-к. «Паліграф», Жылуновіч—да яч. зав. «Камунар»; ад ЦВК: Чарвякоў—да яч. ф-ка «Акцябр» і Вінаградаў—цаг. з-ды Гандальбуду (Тучынка, № 9); ад рэд. газ. «Зьвязда»: Мітліп — ф-ка «Чырвоны Тэкстыльшчык», Асьмоў—друкарня «Зьвязда» і Чалядзінскі—п.-к. краўцоў; Валасевіч (НКЮ)—шпалерная ф-ка, Тамашэўскі (АК КП(б)Б)—Эльвод, Грысевіч (ВСНГ)—Хлебазавод, Васкабоўнікаў (ВСНГ)—друкарня БДВ, Дунец (газ. «Акцябр»)—друкарня БДВ, Рыжоў (ЦСПСБ)—Гандальбуд, Рычкоў (ЦП саюзу працасьветы)—Гандальбуд, Платун (МКА)—Белдзяржбуд, Шастакоў (газ. «Сав. Бел.»)—Белдзяржбуд, Бэнек (СНК)—Белдзяржбуд, Шыпіла (БВД) — ф-ка рымароў, Каранеўскі (Акрза) — каап. прадпр. харчавікоў, Аксючыц (АВК)—Аўтакіраўніцтва, Масюкоў (НКЗ)—міліцыя, Сьцяпанаў (Акрза)—саюз будаўнікоў, Абрамсон (НКГандлю)—Буд. адд. Белжылсаюзу і Шастакоў (ЦСУ)—Белстромтрэсту.

Ячэйкам КП(б)Б прапануецца тэрмінова дагаварыцца з вылучанымі дакладчыкамі і на працягу тыдзёвага тэрміну правесьці па-зачарговым адкрытым партсходы з пастаноўкаю паказанага дакладу. Савецкім ячэйкам—вылучыць дакладчыкаў самім і таксама правесьці ў працягу тыдзёвага тэрміну такія сходы.

Сёньня, у 18 гадзін, у залі пасяджэньняў Мен. АК КП(б)Б (3-ці паверх) Фрунзаўскі РК КП(б)Б склікае нараду вытворчых камун прадпрыемстваў раёну.

На нараду павінны зьявіцца — усе члены вытворчых камун, сакратары вытворчых цэхічэек і парткалектыў і яч. ЛКСМБ, старшыні фабзаўкомаў, кіраўнікі прадпрыемстваў, кіраўнікі вытворчых сэктараў.

Парадак дня: 1. Аб рабоце вытворчых камун і 2. Інфармацыя з месц.

24-га сакавіка, у 19 гадз., у **Доме Камасьветы** Фрунзаўскі РК КП(б)Б склікае раённы сход ленінскага набору 1930 г. з наступным парадкам дня: даклад аб чарговых задачах партыі, рабочае клясы ў выкананьні пяцігодкі і аб партыйхаваньні.

На нараду запрашаюцца ўсе таварышы, якія ўступілі ў партыю ў ленінскія дні 1930 г., а таксама апоргі партыйных і камсамольскіх ячэек.

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 19 гадзін (пакой № 19) групавая кансультацыя для парт. і камс. актыву савецкіх ячэек **т. Ракава** на тэму **«Бліжэйшыя задачы рэканструкцыі дзяржапарату».**

— У 19 гадзін індывідуальная кансультацыя па палітэканоміі **т. Лур'е** (пакой № 21).

Антырэлігійны унівэрсытэт. Заняткі у-ту адбуд. у фіз. аўд. пэдфак. абавязкова.

Да ведама ячэек АЗЕТ. Дакл. Чарвякова, прызначаны на 22 са. пераносіцца на 31 сакавіка. Б. разданыя па ячэйках АЗЕТ, са. ны.

Клюб саўгандальслужачых. А 7 увеч. **масавы вечар асоавіяхімаў актыву Фрунзаўскага райсавету** разам з ваеннорамі ячэек КП(б. ЛКСМБ. На вечары выдае насьп. зэта, прысьвечаная асоавіяхіма рабоце, будзе наладжаны продаж сковай літаратуры. Будзе працаваць

— А 8 гадз. увеч. сход шахматна шачнага актыву саюзу савецкіх і г лёных служачых.

ДА НАРАДЫ РАБКОРАЎ ПА ГРА ДЗКІМ ХАРЧАВАНЬНІ

Сёньня, 22-га сакавіка, у рэдакцыі зэты «Зьвязда» а 6 гадз. увечары ад дзецца АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ НА ДА РАБКОРАЎ І ЧЛЕНАЎ РЭДКА ГІЙ НАСЬЦЕНГАЗЭТ ПА ПЫТАНЬ АГЛЯДУ ГРАМАДЗКАГА ХАР ВАНЬНЯ з удзелам брыгады ўсесо ной камісіі па агляду, арганізава газ. «Правда», якая сёньня прыбыла Масквы.

З прычыны важнасьці гэтага пыта ня просьба да ўсіх рабкораў цэнтра ных газэт «Зьвязда», «Рабочий», цябр», «Савецкая Беларусь» і «Чыр ная Зьмена», членаў рэдкалегій на ценгазэт, а таксама прадстаўнікоў к пэрацыйных арганізацый і ЦП саю зьявіцца на нараду без спазьненьня.

ЗАЎТРА

Пэдгабінэт. 2-я лекцыя інж. Цімаш для выкладчыкаў фізыкі на тэ «Аўтатрактарныя рухавікі» адбудзе ў школе шофэраў (Доўгабрадзкая н каля трамвайнага парку). Пач. у 19 дзін. Яўка выкладчыкаў фізыкі а вязкова.

Саюз саўгандальслужачых. У 19 га у памяшканьні ЦП саюзу склікае нарада культкамісій, рабкораў, сьц кораў і рэдкалегій насьценгазэт з н ступным парадкам дня:

1. Даклад упоўнаважанага «Наш Газэты», 2. Інфармацыя аб паездцы рэдакцыю «Н. Г.» і далейшая рабо рабкораў і сьценкораў і 3. Выбары ганізатара па рабоце з рабкорамі.

Дом Працасьветы. 27 сакавіка а членаў саюзу Працасьветы Белдзяр тэатрам будзе пастаўлены спэктак «Разлом». Білеты ў Доме Працасьвет ад 12—2 гадз. дня і ад 6—10 гадз. уве кожны дзень.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ЦК і Мен. АК МОПР'у з глыбокім жалем паведамляюць аб несвайчасовай сьмерці палітэмігранткі, прыбыўшай з Латвіі,

Тав. ЛУР'Е

ЦК і АК МОПР'у зьвяртаюцца да ўсіх палітэмігрантаў і мопраўцаў г. Менску аддаць свой долг таварышу па барацьбе — удзельнічаць у пахаваньні.

Вынас цела з 1-й сав. больніцы (Ленінская вул.) у суботу, 22-га сакавіка, роўна а 4-й гадз. дня.

ЦК і АК МОПР'у.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ

Сельска-гаспадарчая бібліятэка	Тэатральная бібліятэка	Бібліятэка работніцы і сялянкі		Вакол сьвету	Царская катарга і ссылка	
Г. КУЛІКОЎ і І. УХІН — **Колькі патрэбна корму карове на год.** Стар. 111. Цана 20 кап.	М. ЗОРАЎ — **Перад сьвітаньнем** П'еса ў 4 дзеях. Стар. 95 Цана 50 кап.	Л. ЧАРНЯУСКАЯ — **Падарожніца.** Апавяданьне. Стар. 15 Цана 10 кап.	М. ІЛЬЛІНА — **Моль.** Апавяданьне. Стар. 37 Цана 16 кап.	**У пяскох Кара-Куму.** Зборнік туркестанскіх апавяданьняў. Стар. 157 Цана 45 кап.	В. ДУНАЕЎ — **Гісторыя аднэй галадоўкі.** Стар. 35 Цана 15 кап.	Б. БРАСЛАЎ — **На волю.** Стар. 15 Цана 8 кап.

ЮДА | ЮДА | ЮДА

ТЭАТР і КІНО

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Субота, 22-га сакавіка
АДКРЫЦЬЦЁ СЭЗОНУ БДТ—2 У МЕНСКУ
Б. ЛАЎРЭНЕЎ
РАЗЛОМ п'еса ў 4-х дзеях.
Пастаноўка **Сяргея Разанава.** Музыка **Палапінкіна.** Мастак **Ю. Гольц.** Дырыжэр **Ільля Гіттарц.** Хармайстр **М. Кауфман.**
Уваход па запрашальных білетах.
Рэшта білетаў на 22-III продаўцца толькі ў рабочай касе.
Пачатак роўна а 7 гадз.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
СЁНЬНЯ і ШТОДЗЕННА
„ХІЖИНА дяди ТОМА“
Замежная кіно-п'еса ў 6 част.
ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ: а 1 г. дня і 3 г. 15 м.
Каса—ад 12 г. дня.
ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ: а 7 г., 8 г. і 9-10 г. 30 м.
Каса—ад 5 г. увеч.

КІНО Інтэрнацыянал
2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі
Замежны мастацкі фільм
ЧАЛАВЕК АГНЮ
ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ: а 1 г. дня, 2 г. 30 м., 4 г.
ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ: а 6 гадз., 7 гадз. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м.
Каса—ад 12 гадз. дня.

КІНО Пралетарый
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ЛЕДЗЯНЫ ЛЁС
Драма ў 6 частках.
Пачатак сэансаў: а 6 гадз. 30 м., 7 г. 50 м., 9 гадз. 10 м. і 10 гадз. 30 м.
КАСА адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“
Гістарычная кіно-аповесьць
СЫН РЫБАКА
(М. В. Ламаносаў)) (у 7 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз., 2-га—2 г. 30 м. і 3-га—4 гадз.
Каса адчынена ад 11 г. 30 м.

КІНО Спартак
Новы мастацкі фільм. Сумеснае вытворчасьці „Межрабпом-фільм“ і „Промэтэус“ (Нямеч.)
Паводле драмы **Л. Толстога**
ЖЫВЫ ТРУП драма ў 7 частках.
У галоўн. ролях: НАТА ВАЧНАДЗЕ і В. ПУДОЎКІН
Пачатак 1 с. а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 м.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

УСІМ!!!
УСІМ!!!
УСІМ!!!
Скора ў кіно-тэатры „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ будзе дэманстравацца грандыёзны фільм
ГІГАНТ
Рэжысэр—*Л. Сьцяпанава.*
Апэратар—*В. Сьцяпанаў.*
Вытворчасьці фабрыкі культурфільм „СОВКИНО“.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва.
ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ
БІБЛІЯТЭКА ШКОЛЬНІКА
ДЖОН РЫД.—Дзесяць дзён, якія ўзварушылі сьвет. Стар. 54. Цана 20 кап.
БІБЛІЯТЭКА ФІЗКУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ.
Праф. ЭЛЬБЕРТ.—Дыфтэрыя. Навукова-папулярны нарыс. Стар. 39. Цана 15 кап.
С. БУДАНЦАЎ.
Эскадрыльля сусьветнай камуны. Стар. 30. Цана 12 кап.

ДА ВЕДАМА АНОНСАДАЎЦАЎ
МАНАПОЛЬНАЕ ПРАВА РАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ
газ. „ИЗВЕСТИЯ ЦИК СССР“
передана
БЕЛАРУСКАМУ ГАЗЭТНАМУ БЮРО
АБВЕСТКІ ў газ. „ИЗВЕСТИЯ ЦИК“
здавайце выключна
ГАЗЭТНАМУ БЮРО
Газэтнае Бюро прымае заказы на абвесткі ва ўсе пэрыядычныя выданьні СССР.
Па першым патрабаваньні камандыруецца супрацоўнік для прыёму абвестак.
Звяніце па тэл. 2-49, 5-33, 9-96
БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТНАЕ БЮРО
Ленінская, 34, будынак пошты.

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян, што
АСТАТНІ ТЭРМІН
АБМЕНУ НАБОРНЫХ КНІЖАК
ПРАЦЯГНУТЫ ДА 5 КРАСАВІКА.
З 5-га красавіка старыя хлебныя кніжкі будуць **АНУЛЯВАНЫ.**
Рабочыя і служачыя члены саюзу, якія жывуць у дамах камгасу і прыватных, могуць абмяньваць заборныя кніжкі ў праўленьні жантаў (ад № 12 да № 21) наравне з членамі жантаў.
Праўленьне МЦРК.

ГРАФІКІ-КАЛЕНДАРЫ
„ВЫД. ОРГСТРОЯ“
адпавядаюць усім запатрабаваньням Урадавай Камісіі па пераводзе прадпрыемстваў і устаноў на бесьперапынны вытворчы тыдзень.
Атрымаць можна ў магазынах «ОРГСТРОЯ»:
У Менску—Плац Волі, 15
» Гомелі — Савецкая, 17
» Віцебску—Ленінская, 49.
ЦАНА 1 экз. 2 кап.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты **„ЗЬВЯЗДА“** звяніце па тэл. **2-49**

Абвешч. несапраўдным партбілет № 0806077, выд. Гомельскім АК КП(б)Б на імя Крачака Э. А. **знойдзены.** Лічыць сапраўдным.

Для здачы **АБВЕСТКІ** ў газэту **„ЗЬВЯЗДА“** звяніце па тэл. **7-81**

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

В ВИДУ ПОЛНОГО ИСЧЕРПАНИЯ ТИРАЖА
ПРИОСТАНОВЛЕНА ПОДПИСКА НА ЖУРНАЛ
„СССР НА СТРОЙКЕ“
Орган Цэнтр. Ком. и Моск. Ком. ВКП(б).
Подписавшиеся на срок менее одного года и желающие обеспечить себя получением журнала до конца 1930 года, ДОЛЖНЫ ТЕПЕРЬ-ЖЕ произвести дополнительную подписку до конца года и направить подписные деньги с указанием своего адреса и № своей квитанции по адресу:
Москва, Центр. Ильинка, 3. Периодсектор Госиздата
Вследствие громадных требований, поступивших на журнал «СССР НА СТРОЙКЕ», тиража первого номера не хватило и в настоящее время он печатается дополнительно. Все, не получившие еще первого номера, будут удовлетворяться из дополнительного тиража по мере выхода его.
№ 2 вышел из печати и будет разослан всем подписчикам до 25 марта сего года.
№ 3 выйдет из печати и будет разослан в первой половине апреля.
Госиздат РСФСР
Редакция „СССР НА СТРОЙКЕ“

Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакументы: лічыць несапраўднымі:

Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 1/62474 Федаровіча В. М. 511
Каап. кн. Ляпешка К. І., вул. Пухавіцк. спаж. т-ва 512
Чл. біл. саюзу працасьветы № 2890 Пілюўскай М. А. 513
Каап. кн. Макаровіча П. Ф., вул. Мен. прыгар. спаж. т-ва «Земляроб». 514

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.

Менск, Галоўлітбел № 337.